Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі!

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

№ 177 (5010)
ЖНІЎНЯ
11
СУБОТА
1934 г.
год выдання XVII

Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

СЕННЯ У НУМАРЫ

ПІЛЬНА АХОЎВАЦЬ РЭВОЛЮЦЫЯНУЮ ЗАКОННАСЦЬ—З ВЫСТУПЛЕННЯ НАМ. ПРАКУРОРА САЮЗА ССР ТАВ. **ВЫШЫНСКАГА** НА З'ЕЗДЗЕ РАБОТНІКАЎ ЮСТЫЦЫІ

АРТЫКУЛЫ: ПЕРАДАВЫ — ЗАХАВАЦЬ УРАДЖАЙ ІЛЬНУ; **Х. ДУНЕЦ**—ДЗВЕ РАДЗІМЫ; ПРАФ. **СУРТА** і ПРАФ. **ФРЫД** — АБ КІШЭЧНЫХ ЗАХВОРВАННЯХ І МЕРАХ ІХ ПАПЯРЭДЖАННЯ; **Н. КАДАКАС**—ПЛАН—АСНОВА ПАСПЯХОВАЙ БАРАЦЬБЫ ЗА ЖЫВЕЛА ГАДОЎЛЮ; **ГЕРМАН ПЕТЧ**—КУЛЬТУРНЫ ЎЗДЫМ НЯМЕЦКАЙ ВЁСКІ Ў СССР.

КАРЭСПАНДЭНЦЫІ: ВІШНЕЎСКІ—МАШЫНІСТ СЦЯПАН ЛАЎРЭНЕЎ; **ЯНКА**—САБАТАЖ СПРАВЫ БЕЛАРУСІЗАЦЫІ; **БЕРМАН** — АБ МСЦІСЛАЎСКІХ КААПЕРАТЫЎНЫХ ЖУЛІКАХ І ІХ АПЕКУНАХ.

ПІСЬМЫ РАБОЧЫХ І КАЛГАСНІКАЎ.

ЗА МЯЖОЙ: ЯПОНІЯ РЫХТУЕЦЦА ДА «КРЫЗІСА 1935-36 ГОДА»; НАПАД ЯПОНСКІХ СЯЛЯН НА ЎПРАЎЛЕННЕ ГУБЕРНАТАРА.

ПА СССР: ПІОНЕР **ВАНЯ МЯТА** ВЫРАТАВАЎ АГІТСАМАЛЁТ.

ЗАХАВАЦЬ УРАДЖАЙ ІЛЬНУ

Надрукаваныя ўчора пастановы ЦУнаркома Саюза і перадавая ЦО партыі «Праўды» з'яўляюцца дакументамі, якія павінны мабілізаваць УСЕ партыйныя і совецкія арганізацыі, усю масу калгаснікаў і аднаасобнікаў на барацьбу за захаванне ўраджаю ільну.

БССР пачала масавую ўборку ільну 15 ліпеня. Убіраем мы, стала быць, ужо 20 ДЗЁН (паводле даных на 5 жніўня), а выцераблена толькі 53,1 проц. ЯШЧЭ ПАЛОВА ІЛЬНУ НЕ ВЫЦЕРАБЛЕНА. А ўсё-ж асноўная маса ільну ўжо выспела. ЛЁН ПЕРАСТОЙВАЕ. ЛЁН ПСУЕЦЦА. Але сказаць, што палова ільну не выцераблена — гэта значыць узяць толькі СЯРЭДНІЯ лічбы. Калі-ж мы прасочым КАНКРЭТНА ход уборкі ільну па АСОБНЫХ раёнах, то атрымаем такія даныя: ільнаводчы Сенненскі раён выцерабіў 99,4 проц., Лёзненскі—84,4 проц., а ільнаводчыя раёны: Мсціслаўскі—34,2 проц., Расонскі—41,1 проц.; нелільнаводчыя—Любаньскі, Аршанскі, Чырвонаслабодскі—выцерабілі звыш 90 проц., а ПРАПОЙСКІ, ПАРЫЦКІ, УЗДЗЕНСКІ, КАРМЯНСКІ—не больш 10. Устае пытанне, аб чым думае кіраўніцтва апошніх раёнаў?

Чым тлумачыцца недапушчальнае адставанне па церабленню больш чым у 15 раёнах? Тут справа не абышлася, зразумела, без элементаў кулацкага сабатажу ў радзе сельсоветаў, калгасаў. Але асноўнае не ў гэтым. У даным выпадку падзагаловак ва ўчарашнім нумары «Звязды» няправільна пераносіць цэнтр цяжару на кулацкі сабатаж. Асноўную прычыну ганебных тэмпаў уборкі ільну па гэтых раёнах трэба шукаць у расхлябанасці, непаваротлівасці партыйна-совецкіх арганізацый гэтых раёнаў, няўменні спалучаць уборку зернавых з уборкай ільну.

Але выцераблены лён—гэта поўправы. Калі лён СВОЕЧАСОВА не разаслаць або не замачыць, СВОЕЧАСОВА не падняць са сцеліішчаў, то не дапаможа і своечасовае церабленне. Між тым, на 5 жніўня па БССР разаслана толькі 22,9 проц. ТРЫ ЧВЭРТКІ выцерабленага пяжыць на полі і ЗНАХОДЗІЦЦА ПАД ЯЎНАЙ ПАГРОЗАЙ псавання.

Але 22,9 проц. разаслананага ільну—гэта таксама СЯРЭДНІЯ лічбы. 21 РАЁН НЕ ПРЫСТУПІЎ яшчэ да рассціпу. Што топку, што Пухавічы выцерабілі 89,1 проц., калі разаслана ў іх толькі 5,9 проц.? Што топку, што Бялынічы выцерабілі 65,5 проц., калі разаслана толькі 4,2 проц.? Пераважная большасць ільнаводчых раёнаў ужо дапусціла разрыў паміж церабленнем і рассціпам. Здавальняюча вядуць рассціп толькі Сянно, Бешанковічы, Расоны, Асвея і Дрыса (апошнія тры мачанцовыя раёны).

Выключна дрэнна ідзе ўздым ільну са сцеліішчаў. Тут НІ АДЗІН РАЁН не можа пахваліцца большэвіцкай работай. МІЖ ТЫМ АСАБЛІВАСЦЬ УБОРКІ ІЛЬНУ ЗАКЛЮЧАЕЦЦА Ў ТЫМ, ШТО ТУТ УСЯКІ РАЗРЫЎ ПАМІЖ АСОБНЫМІ ПРАЦЭСАМІ ЎБОРКІ МОЖА ПАГУБІЦЬ УВЕСЬ УРАДЖАЙ.

Не менш трывожным ва ўборцы ільну з'яўляецца АДСТАВАННЕ АДНААСОБНІКАЎ. Калі калгасы ўбіраюць лён дрэнна, то аднаасобнікі яшчэ горш. (Па калгасах выцераблена 57 проц., па аднаасобнаму сектару 44 проц.). Ёсць раёны, дзе аднаасобнікі толькі-толькі прыступілі да церабленння (Гарадок—20,5 проц., Віцебск—17 проц. і т. д.). Калі мы ўспомнім, што ва ўсе гады ільнозагатовак перш за ўсё аднаасобнікі зрывалі выкананне плана, што зніжэнне нумара валакна ішло за лік аднаасобнікаў, то нам стане ясным, што ў гэтым годзе мы стаім перад пагрозай паўтарэння памылак мінулых гадоў. Каб уніікнуць іх —ТРЭБА УЗЯЦЬ У СВАЕ РУКІ СПРАВУ ЎБОРКІ ІЛЬНУ Ў АДНААСОБНЫМ СЕКТАРЫ.

Ураджай ільну пад пагрозай. Калі ўборка ільну будзе ісці самацёкам яшчэ адну-дзве пяціднёўкі, можа быць зведзена на нішто ўся велізарная работа па сяўбе і праполцы ільну.

Што трэба зрабіць?

Трэба:

па-першае, ПЕРАКЛЮЧЫЦЬ АСНОЎНУЮ МАСУ ЖАНЧЫН НА ЦЕРАБЛЕННЕ І РАССЦІЛ ІЛЬНУ. Там, дзе мала жанчын, НЕАБХОДНА ПРЫЦЯГНУЦЬ ДА ЎБОРКІ ІЛЬНУ МУЖЧЫН; па-другое, біцца за кожную гадзіну работы ільноцерабілак, машын Гільштэйна і «Эддзі», шырока скарыстаць грэбні для ачосу ільну. Гэта паскорыць рассціп мінімум на тыдзень; па трэцяе, перавесці работы па ўборцы ільну на ІНДЫВІДУАЛЬНУЮ ЗДЗЕЛЬШЧЫНУ, выкараняючы самым бязлітасным чынам работу скопам; па-чацвертае, шырока растлумачыць і неадкладна прымяніць ЗАКОН УРАДА АБ НАЛІЧЭННІ КАЛГАСНІКАМ, ПРАЦУЮЧЫМ ПА ЎБОРЦЫ І АПРАЦОЎЦЫ ІЛЬНУ, ДВУХ ПРАЦАДЗЁН ПРЫ ВЫКАНАННІ ДЗЁННАЙ НОРМЫ. Па-пятае, устанавіць такі парадак, каб калгасы, атрымліваючы хлеб па меры здачы ільну, НЕАДКЛАДНА РАЗМЯРКОЎВАЛІ ЯГО ПА ІЛЬНЯНЫХ ПРАЦАДНЯХ. ВАРТА ТОЛЬКІ ПРАВЕСЦІ ПЕРШУЮ РАЗДАЧУ, ЯК АДРАЗУ НАСТУПІЦЬ ПЕРАЛОМ У АДНОСІНАХ КАЛГАСНІКАЎ ДА ЎБОРКІ ІЛЬНУ.

Уборка ільну—востры ўчастак класавай барацьбы. Гэта нам трэба моцна ўсвоіць. Таму нідзе так не патрабуецца КАНКРЭТНАГА, ШТОДЗЁННАГА КІРАЎНІЦТВА, ЯК НА ЎБОРЦЫ ІЛЬНУ.

Уборка ільну будзе сур'ёзным экзаменам для ЎСІХ раёнаў і ільнаводчых і неільнаводчых. Гэта патрэбна добра ўсвоіць кожнаму кіраўніку раёна, МТС, сельсовета, калгаса.

ЗЯБЛІВА—АДЗІН З ВАЖНЕЙШЫХ СРОДКАЎ У БАРАЦЬБЕ ЗА ПАВЫШЭННЕ УРАДЖАЙНАСЦІ

У КОЖНАЙ БРЫГАДЗЕ ВЫЛУЧЫЦЬ ПАРКУ КОНЕЙ ДЛЯ ЎЗДЫМУ ЖНІВЕНЬСКАГА ЗЯБЛІВА

ПОЛАЦК

МАШЫНЫ ГІЛЬШТЭЙНА СТАЯЦЬ, ХОЦЬ КОЖНАЯ МАГЛА-Б ЭКАНОМІЦЬ 15 ЧАЛАВЕКА-ДЗЁН

У калгасе **«Чырвоны маяк»**, Бельскага сельсовета, з 20 гектараў ільну 16,20 ужо абмалочана і разаслана. 10 жніўня брыгада № 3, дзе брыгадзірам **Бердашкевіч**, заканчвае здачу трасты дзяржаве.

У своечасовым і датэрміновым сканчэнні абмалоту і апрацоўкі ільну вялікую дапамогу аказала машына Гільштэйна. На машыне працавалі лепшыя ўдарнікі **Матузоў Ефім, Бердашкевіч Фёдар** і **Бердашкевіч Рыгор.** Яны добра аўладалі тэхнікай работы машыны з першых-жа дзён.

За першы дзень было абмалочана 115 коп. На машыне працуюць 8 дарослых і 2 падросткі падганяюць коней. Для таго каб абмалаціць гэтыя 115 коп рукамі, патрэбна 23 чал. За чатыры дні выцераблена, абмалочана і замочана 20 гектараў ільну. Без выкарыстання машыны гэта работа працягнулася-б 15-20 дзён. К 20 жніўня план здачы трасты калгас выканае поўнасцю.

Нядрэнна арганізавана работа па пярвічнай апрацоўцы ільну і ў калгасах імя **Сталіна**, М. Сітнянскага сельсовета, **«Чырвоная Сякераўшчына»**, Громаўскага сельсовета. **Выцераблены снап ільну абчосваецца тут-жа на полі спецыяльнымі грэбнямі.** Калгасы імя Сталіна і «Чырвоная Сякераўшчына» пры такой арганізацыі працы закончылі абмалот і замачылі ўвесь лён. У калгасе імя Сталіна 5 гектараў ужо вынята з мочкі і разаслана. **У выніку таго, што ў калгасе «Чырвоны маяк» праводзіцца абмалот машынай Гільштэйна і ў калгасах імя Сталіна, «Чырвоная Сякераўшчына» праводзіцца ачос галован грэбнямі, няма кілкага разрыву паміж церабленнем, абмалотам, замочкай і рассцілам.** Гэтыя калгасы дабіліся, што якасць трасты будзе не ніжэй 2 нумара, валакно не ніжэй 11 нумара. Да 20 жніўня ўвесь план здачы трасты будзе выканан на месяц раней, чым у мінулым годзе.

Але машыны Гільштэйна стаяць амаль ва ўсіх калгасах раёна. **З 48 машын Гільштэйна працуе толькі адна, у калгасе «Чырвоны маяк».** Адсюль не дзіва, чаму ў Полацкім раёне з выцераблена 1681 гектара ільну абмалочана толькі 364.

РК КП(б)Б спецыяльнай пастановай зусім правільна забараніў абрэзку галовак нажамі і косамі, **але арганізацыяй работы машын Гільштэйна і ачосу на грэбнях ніхто ў раёне не заняўся.**

Н. НЕЙДЛІН.

НАРОЎЛЯ

АДНААСОБНІКА КЕ ЗАУВАЖАЮЦЬ

(Ад спецыяльнага карэспандэнта «Звязды»)

Вясной прыліў аднаасобнікаў у калгасы быў тут нязначны, а пасля скантэння сяўбы зусім спыніўся. Чаму? Адказ на гэта пытанне можа быць дан толькі адзін. У раёне спрод аднаасобнікаў зусім не вядзецца палітычна-масавая работа, аднаасобніка тут не прыкмячаюць.

Ёсць вёскі, дзе частка аднаасобнікаў па два-тры гады не выконвае сваіх абавязацельстваў перад дзяржавай і адчувае сябе спакойна, іх ніхто не турбуе.

Разам з гэтым можна сустрэць цэлы рад фактаў грубага адміністравання ў адносінах да аднаасобніка.

Куды варты, напрыклад, такі факт: Калгас **«Чырвоны цешкаў»** самавольна скасіў 40 га сенажаці аднаасобнікаў вёскі Ліхаўня, а аднаасобнікі засталіся без сена. Цэлы месяц аднаасобнікі дабіваліся ў раённых арганізацыях адводу сенажаці, але ўсюды атрымлівалі адзін і той-жа адказ: «сена ў балотах шмат, едзьце і касіце». Нарэшце, у канцы ліпеня райземадзел адвёў 30 га сенажаці, якія цалкам заліты водою і касіць там нельга.

Зразумела, што такія адносіны да аднаасобніка ні да чаго іншага, як да абвастрэння ўзаемаадносін паміж калгаснікамі і аднаасобнікамі не прывядуць. А гэта — вялікі тормаз на шляху прыліву аднаасобнікаў у калгасы.

Другі тормаз калектывізацыі—гэта штучнае затрымліванне прыліву аднаасобнікаў у калгасы. Там, дзе адчуваецца недахват рабочай сілы, праўленні калгасаў ахвотна прымаюць нават без усякага разбора. Там-жа, дзе з рабочай сілай больш-менш добра, там заявы аднаасобнікаў аб уступленні ў калгас марынуюцца гадамі, ставяцца ўсякія рагаткі, каб не прыняць у калгас.

Аднаасобнік **Война Рыгор** з вёскі Ліхаўня расказвае, што ў мінулым годзе яго не прынялі ў калгас «Чырвоная пчала», толькі таму, што не хапіла 10 пудоў бульбы на насенне. А такіх фактаў у раёне можна сустрэць нямала.

Што-ж робяць раённыя арганізацыі, каб арганізаваць прыліў аднаасобнікаў у калгас? Нічога.

ФРАЛОЎ.

ФОТА А. МІКУЦКАГА



Шыроказахватная ільнацерабілка «ВНІІЛ»—5» на рабоце ў калгасе імя Варашылава (Шклоўскі раён). За рулём—лепшы трактарыст тав. ЗАЙЧАНКА.

ДА СУДОВАЙ АДКАЗНАСЦІ АШУКАНЦАЎ З БАГУШЭЎСКАГА ІЛЬНАЗАВОДА

Вядома, што ў мінулым годзе ашуканства ільназдатчыкаў адбывалася на многіх ільназаводах. Паспаныя ў свой час камісіі ЦК і СНК выявілі на многіх заводах злачынныя факты паніжанай ацэнкі якасці прымаемай трасты. Ашуканствам ільназдатчыкаў адзначаецца БАГУШЭЎСКІ ільназавод. Толькі недапушчальнай бяздзейнасцю АРШАНСКАЙ пракуратуры можна вытлумачыць, што жулікі з багушэўскага ільназавода не былі судзімы яшчэ ў 1933 годзе. Як сігналізуе сенненская кантора Заготільна завод і ў гэтым годзе мае намер прадаўжаць сваю злачынную практыку. Трэба ў корані і адразу перасекці спробы прадаўжаць практыку ашуканства ільназдатчыкаў, практыку хабарніцтва і вымагацельства. Дырэктар багушэўскага ільназавода ЯЎМЕНАЎ павінен быць неадкладна знят з работы і прыцягнут да судовай адказнасці як і Цігр і тэхнічны кіраўнік Камендантаў.

ТРЭБА ІМЕННА ЗАРАЗ, У ПАЧАТКУ ІЛЬНАЗАГАТОВАК, АДКРЫЦЬ ШАЛЁНЫ АГОНЬ ПА ЖУЛІКАХ, АСЕЎШЫХ НА ІЛЬНАЗАВОДАХ І ПРАБУЮЧЫХ АШУКАЦЬ ІЛЬНАЗДАТЧЫКА, ДЫСКРЭДЫТАВАЦЬ СОВЕЦКІ ЗАВОД.

На Багушэўскім ільназаводзе, Аршанскага раёна, пры прыёмцы трасты ашукваюць здатчыкаў. Так, 31 ліпеня калгас **«Аляксандрава»**, Новасельскага сельсовета 2, Сенненскага раёна, здаў на Багушэўскі ільназавод два цэнтнеры трасты новага ўраджаю. Траста была прынята як № 1,25.

Аднак, праз дзень камісія пры праверцы выявіла, што прыёмшчык ашукаў калгас. Вось што пішацца ў акце камісіі:

«Пры праверцы ўстаноўлена, што тэхнічны кіраўнік Багушэўскага ільназавода т. **Камендантаў** 31 ліпеня прыняў ад калгаса «Аляксандрава» два цэнтнеры трасты № 1,25, якая адпавядае № 1,50, чым ашукаў калгас».

Трасту прымаў разам з Камендантавым і сартыроўшчык **Зайцаў**. Старшы сартыроўшчык завода **Цігр** добра ведае аб гэтых злоўжываннях, але ніякіх мер да ашуканцаў не прымае.

Ды і як яму прымаць меры, калі ён сам у мінулым годзе разам з Камендантавым ашукваў здатчыкаў, браў ад іх хабары. Больш высокія нумары ільну запісваліся тым здатчыкам, якія прывозілі Камендантаву і Цігру масла, пшаніцу, бараноў і т. д.

Адпаведныя арганізацыі павінны зацікавіцца гэтай справай і прыцягнуць вінаватых да судовай адказнасці.

Адначасова трэба зацікавіцца дзейнасцю дырэктара ільназавода т. **Яўменава**, які не адчувае адказнасці за тое, што робіцца на заводзе.

ШУРМЕЛЕЎ

Загадчык сенненскага аддзялення «Заготлён».

МСЦІСЛАЎСКІЯ ІЛЬНАЗАВОДЫ НЕ ГАТОВЫ ДА ПРЫЁМКІ ТРАСТЫ

У Мсціслаўскім раёне ёсць чатыры ільназаводы. Але ні адзін з іх не гатоў да прыёмкі трасты.

Складаў і шохаў на двух заводах зусім няма, а на астатніх шохі закіданы непераапрацаванай трастой загатовак 1933 года.

Куды будуць класці трасту ўраджаю 1934 года, хто будзе прымаць трасту, кіраўнікі завода не ведаюць. Заводы не забяспечаны ні прыёмшчыкамі, ні сартоўшчыкамі.

На **Мсціслаўскім** і **Пацолтаўскім** заводах скапіўся велізарны запас трасты леташніх загатовак. Гэтай трасты можа хапіць на цэлы год, нават пры трохзменнай рабоце. Між тым, заводы працуюць толькі ў адну змену і з месяца ў месяц выконваюць свае вытвор'чыя праграмы толькі на 25-30 процантаў. Абодва заводы павінны даваць штодзённа прадукцыі 4500 кілограм, а даюць не больш 1000 кгр.

У чым прычыны? На заводах вялікая цякучасць рабочай сілы. Даволі сказаць, што на Пацолтаўскім заводзе з 85 рабочых, працаваўшых яшчэ 5 ліпеня г.г., асталося на 20 ліпеня толькі 19. Зарплата рабочым не выплачваецца ўжо чатыры месяцы. Харчаванне дрэннае. Здзельшчына не ўведзена. Поўнае разлажэнне асобных кіраўнікоў завода, бесправубнае п'янства, пакражы, шкодніцтва, праследванне рабкораў і піянераў (Мсціслаўскі завод, дырэктар **Кузняцоў**)—вось прычыны зрыву работы на ільназаводах.

Не лепш стаіць справа на Печкаўскім ільназаводзе. Тут патрэбен буйнейшы рамонт, але да гэтага часу да яго не прыступілі. Неабходна праверыць усе трансмісіі, змяніць шківы, адрамантаваць трасілкі, мялкі, набыць шасцёркі і штангі для трасілак, насы і помпы.

Усе гэтыя часткі і матэрыялы можна дастаць на месцы. Але дырэктар завода **Астапенка** і тэхнікраўнік **Марозаў** бяздзейнічаюць.

Пячонкаўскі ільназавод па плану павінен быў быць пушчан у эксплаатацыю яшчэ 1 красавіка, але з-за бяздзейнасці дырэктара **Котава** рамонт праходзіць чарапашымі тэмпамі, і дагэтуль невядома, калі завод будзе пушчан.

Машыны не забяспечаны неабходнымі часткамі, мялкі ўстаноўлены без шасцёрак і станкоў, кудзелеачышчальнік устаноўлен без крыш і мосцікаў. Не гатоў яшчэ калодзеж. Завод не мае нават паса і каларыфета, без якіх сушка трасты немагчыма, не гаворачы ўжо аб такіх неабходных для завода рэчах, як кастрасосныя вентылятары.

Райком партыі і райвыканком да гэтага часу не займаліся сур'ёзна пытаннем падрыхтоўкі ільназаводаў да прыёмкі новага ўраджаю.

М. БЕРМАН.

АД РЭДАКЦЫІ:

Карэспандэнцыя т. Бермана з'яўляецца другім трывожным сігналам з ільназаводаў. Гэта паказвае, што Наркамлегпром БССР, якому падпарадкаваны ільназаводы, не забяспечыў падрыхтоўку іх да новага сезона, паставіўшы гэтым пад прамую пагрозу зрыву выкананне плана ільназагатовак. Намеснік наркома прамысловасці т. **Бехцераў** усё яшчэ разважае, скліча дзесяткі нарад, а практычнага, канкрэтнага кіраўніцтва ільназаводамі няма.

Дакуль будзе працягвацца гэта абураючая бездзейнасць. «Звязда» чакае ад Наркамлегпрома неадкладных мер для ліквідацыі прарыву на ільназаводах. Адначасова рэдакцыя чакае канкрэтнага адказу ад Мсціслаўскага РК КП(б)Б і РВК, што яны робяць па сутнасці справы.

ЛІКВІДАВАЦЬ АДСТАВАННЕ СОЎГАСАЎ

Ход уборкі і хлебаздачы па соўгасах БССР паказвае, што большасць соўгасаў не зрабілі належных выводаў з указанняў т. СТАЛІНА на XVII з'ездзе партыі аб адставанні соўгасаў.

Для пацвярджэння гэтага даволі супаставіць ход уборкі і хлебаздачы па БССР і па соўгасах.

У той час калі па БССР на 5 жніўня ўбрана 80,6 проц. зернавых, ТО ПА СОЎГАСАХ УБРАНА 55 ПРОЦ. Яшчэ большае адставанне соўгасаў па хлебапастаўках дзяржаве.

Соўгасы БССР уступілі ва ўборачную кампанію гэтага года параўнальна лепш тэхнічна ўзброенымі, чым у мінулыя гады. Пры правільным скарыстанні наяўных уборачных машын соўгасы мелі магчымасць правесці ўборку зернавых максімум за 15 дзён. Такім чынам калі нават лічыць, што масавая ўборка па соўгасах пачалася 20 ліпеня, то і на 5 жніўня ўборка павінна была быць завершана.

Дзе-ж прычыны адставання соўгасаў на ўборцы?

Лепш за ўсё гэта можна прасачыць на практыцы работы соўгасаў МЕНМАЛАКОПРОМТРЭСТА (дырэктар СЦЯПАНАЎ). Соўгасы гэтага трэста забяспечаны ўборачнымі машынамі лепш чым іншыя соўгасы. Паводле падлікаў самога т. Сцяпанава, соўгасы гэтага трэста мелі магчымасць убраць зернавыя аднымі машынамі за 8 дзён. На справе-ж план уборкі па Менмалакопромтрэсту на 5 жніўня выкананы усяго на 53,2 проц.

Мапюнак работы соўгаса «КОСІНА», Лагойскага раёна, на ўборцы 5 жніўня ў значнай меры ўскрывае прычыны адставання гэтага і раду іншых соўгасаў.

Авёс у соўгасе «КОСІНА» перасеяў. Даволі было пусціць на поўны ход жняркі, каб убраць авёс за два дні. Але машыны ў гэты дзень зусім не працавалі. Чаму? Аказваецца, своечасова не паведамілі вязальшчыц, што ў гэты дзень будуць жаць авёс. Машыны прастаялі большую частку дня ў чаканні вязальшчыц. Вязальшчыцы не з'явіліся. Машыны і коні ў самы гарачы час уборкі прастаялі цэлы дзень.

Нярэдка бывае, што з-за дробязі машыны прастойваюць днямі. Так у соўгасе БЯРЭЗІНО, Бярэзінскага раёна, з-за паломкі планкі, якую можна літаральна зрабіць на працягу адной гадзіны, жнярка прастояла пяра дня. У большасці соўгасаў спраўдная выпрацоўка на жнярку не перавышае 2-3 гектары.

Нераспарадчасць, слабая падрыхтоўка кадраў, дрэнная арганізацыя працы, адсутнасць сапраўднай здзельшчыны дзе-ні-дзе і антымеханізатарскія тэндэнцыі—вось асноўныя прычыны затрымкі ўборкі.

БАРАЦЬБА СА СТРАТАМІ ЯШЧЭ НЕ СТАЛА Ў ЦЭНТРЫ ЎВАГІ БОЛЬШАСЦІ СОЎГАСАЎ. Толькі гэтым тлумачыцца існуючы недапушчальны разрыў паміж уборкай, звозкай і абмалотам. Гэта-ж простае злачынства, калі па соўгасах Племтрэста ўсяго звезена 10 проц. убранага збожжа.

І тут асноўнай прычынай з'яўляецца дрэнная арганізацыя працы. Што справа абстаіць іменна так, досыць супаставіць ход уборкі ў двух соўгасах. Соўгасы «Самуэлева» і «Анапаль», Менскага раёна, знаходзяцца на невялікай адлегласці адзін ад другога. Забяспечаваць машынамі і рабочай сілай аднолькавая, між тым, соўгас «Анапаль» убраў 87 проц. зернавых, а «Самуэлева» толькі 60.

У чым-жа справа?

Аказваецца, што вязальшчыца ў соўгасе «Анапаль» у сярэднім звязвае 0,6 гектара, а ў «Самуэлева» — 0,25 гектара. І не дзіва: у «Анапалі» вязальшчыцы ведаюць норму, пераведзены на індывідуальную здзельшчыну, а ў «Самуэлева» вязальшчыцы працуюць «скопам», работа не арганізавана.

Яшчэ горш абстаіць справа з малацьбой.

У соўгасе «Косіна» (Лагойшчына) 5 жніўня 33 рабочых і 7 пар коней прастаялі да паўдня проста з-за таго, што тут не маглі наладзіць работу малатарні і трактара.

Зразумела, гэта адбіваецца на выкананні плана хлебапаставак.

Але справа не толькі ў гэтым. Жаданне прытрымаць збожжа, іменнае перапаменшыць ураджайнасць адыгрывае не малую ролю ў зрыве многімі соўгасамі нават і ліпеньскага плана хлебапаставак. Мы ўжо ілюстравалі гэтыя антыдзяржаўныя тэндэнцыі на прыкладзе АРШАНСКАГА свіназаводтрэста.

Трэба сказаць, што пакуль што яны не сустракаюць належнага адпору з боку ўпаўн. НК соўгасаў і райкомаў.

ЖНІВЕНЬ—РАШАЮЧЫ МЕСЯЦ ВЫКАНАННЯ ПЛАНА ЗЕРНАПАСТАВАК. Соўгасы павінны быць у першых радах барацьбітоў за датэрміновае выкананне плана хлебаздачы. Для гэтага неабходна ліквідаваць разрыў паміж уборкай, абмалотам і хлебаздачай, арганізаваць сапраўдную барацьбу са стратамі на ўсіх участках уборачнай і абмалоўчых, з усёй большэвіцкай рашучасцю. З усёй большэвіцкай рашучасцю павінны быць выкарчаваны антыдзяржаўныя тэндэнцыі. Толькі пры гэтых умовах соўгасы БССР здолеюць спраўдзіць ускладзеную на іх партыяй і урадам задачай.

ХОД ХЛЕБАЗДАЧЫ, АБМАЛОТУ І ЎБОРКІ

ПА ТРЭСТАХ УПОЎНАРКОМСОЎГАСАЎ НА 5 ЖНІЎНЯ 1934 Г.

(у процантах)

№№ п. п.	ТРЭСТЫ	Выкан. плана хлебаздачы	Абмалочана да зжатага	Засеяна да зжатага	Зжата зернавых
1.	Гомельскі Малпромтрэст	25,3	17,8	81,9	78,4
2.	Віцебскі Малпромтрэст	15,2	7,7	34,1	44,3
3.	Племтрэст	14,9	—	10,0	60,7
4.	Менскі Малпромтрэст	12,6	7,6	40,6	56,3
5.	Менскі Свіназаводтрэст	12,5	10,0	53,3	53,9
6.	Аршанскі Свіназаводтрэст	9,4	10,9	46,4	47,0
7.	Магілеўскі Свіназаводтрэст	4,1	9,3	67,1	54,5
	Усяго:	12,8	10,9	55,8	54,9

РАННЯЕ ЗЯБЛІВА—МАГУТНЫ СРОДАК У БАРАЦЬБЕ ЗА ПАВЫШЭННЕ УРАДЖАЙНАСЦІ

У чым заключаюцца перавагі зяблівага ворыва ў параўнанні з вясновым ворывам?

Першая перавага, агратэхнічнага парадку, заключаецца ў тым, што своечасова і добраякасна праведзенае зяблівa на поўную глыбіню стварае спрыяльныя ўмовы для дзейнасці мільярдаў непрыкметных простаму воку карысных бактэрый у глебе. Гэтыя бактэрыі ўзмацняюць сваю работу над разлажэннем і пераводам у добра ўсвойваемыя спажыўныя для расліны матэрыі, розныя раслінныя і іншыя астаткі. У глебе пасля зяблівa адбываецца шпаркае накапленне каштоўных матэрый і ў прыватнасці азота.

Па даных Саратаўскага зернавога інстытута, у метравым пласту на адным гектары на жнівеньскім і верасеньскім зяблеву накапілася 5,55 цэнт. селітры, а на адным веснавому ворыву толькі 0.53 цэнт. на гектар. Інакш кажучы, **зяблівае ворыва, своечасова праведзенае, накапляе ў глебе селітры ў 10 раз больш, чым веснавое ворыва.**

Такія вынікі даюць і рад іншых даследчых устаноў.

На працягу раду год устаноўлена, **што зяблівае ворыва, праведзенае ў жніўні, накапляе селітры ў 2-3 разы больш, чым у кастрычніку.** Тлумачыцца гэта вельмі проста: рана ўзаранае зяблівa садзейнічае пранікненню ў глебу паветра, цяплыні і вільгаці, што ў сваю чаргу добра адбіваецца на дзейнасці карысных бактэрый, якія пераводзяць хёртвыя запасы глебы ў гатовую спажыву для раслін.

Бясспрэчным з'яўляецца тое, што зяблівае ворыва павінна спалучацца з папярэднім лушчэннем іржышча. Перавагі гэтай камбінацыі заключаюцца ў тым, што лушчэнне пазбаўляе поле ад лішніх нахлебнікаў—пустазелля, якое пасля ўборкі асабліва энергічна пачынае развівацца,—высушвае глебу і сваім існаваннем забірае ад культурных раслін спажыўныя матэрыі. Таму неадкладнае, следам за ўборкай, лушчэнне і праз 20-25 дзён зяблівае ворыва з'яўляецца самым рацыянальным спосабам апрацоўкі глебы пад яравыя культуры будучага года. Тэрмін лушчэння прадаўжаецца прыкладна месяц і павінен закончвацца да 10-15 жніўня, з тым, каб узлушчанае іржышча рана зазямліць на поўную глыбіню. Адсюль вынікае такі вывад: **зараз-жа пасля лушчэння патрэбна пераключыцца на ранняе зяблівае ворыва.**

Там, дзе не было праведзена лушчэнне, ранняе зяблівае ворыва, а потым веснавое пераворванне, з'яўляецца лепшым спосабам апрацоўкі глебы пад яравыя культуры, асабліва пад авёс.

У параўнанні з веснавым узорваннем, ранняе зяблівa адыгрывае вялікую ролю ў справе барацьбы з пустазеллем, рознымі шкоднікамі і хваробамі раслінаў.

Немалаважнае значэнне адыгрывае і якасць правядзення зяблівага ворыва і спосабы апрацоўкі.

Глыбіня вызначаецца поўным уздымам узорваемага пласта глебы, які звычайна дасягае 15-18 см., прычым ніколі нельга выварочваць наверх мёртвы падзолісты пласт глебы.

Ворыва праводзіцца адвальнымі плугамі, прычым тут патрэбна, каб яно было больш глыбінным і грабністым, што дасягаецца пры ўзорванні ў раннія тэрміны, калі глеба яшчэ сухая.

Пры зяблівым ворыве недапушчальна пілкае асеннее баранаванне, якое можа прынесці толькі шкоду непатрэбным распыленнем глебы і пазбавіць магчымасці роўнамернага накаплення вільгаці, якое адбываецца пры грабністым і глыбінным зяблеве.

Перавага зяблівa заключаецца не толькі ў яго агратэхнічнай выгадзе. Зяблівa мае выключнае значэнне арганізацыйна-гаспадарчага парадку. Разгружаючы веснавыя работы, мы маем усе магчымасці правядзення сяўбы ў раннія тэрміны. Павышэнне-ж ураджаю ад ранніх тэрмінаў сяўбы відавочна даказана на вопыце багучага 1934 года. Добры ўраджай яравых зернавых, і асабліва аўса, у бягучым годзе з'яўляецца пераважна вынікам таго, што масы калгаснікаў і рабочых соўгасаў зразумелі перавагі ранняй сяўбы.

Справа гонару кожнага соўгаса і калгаса — поўнае правядзенне зяблівага ворыва ў раннія тэрміны.

БЕРКОЎСКІ.

ПЛАН—АСНОВА ПАСПЯХОВАЙ БАРАЦЬБЫ ЗА ЖЫВЁЛАГАДОЎЛЮ

Ніжэй мы змяшчаем артыкул загадчыка фермы калгаса «Ўсход», Бабруйскага раёна, тав. КАДАКАСА МІКАЛАЯ.

На прыкладзе гэтай фермы мы бачым, якое вялізарнае значэнне для развіцця жывёлагадоўлі мае загадзя складзены, абдуманы план работы па пытанню гадавання маладняка, стварэння кармовай базы і ўзняцця прадукцыйнасці жывёлагадоўлі. Ферма калгаса «Ўсход» павінна паслужыць прыкладам для другіх калгасаў, як трэба па-большэвіцку змагацца за далейшае ўмацаванне і развіццё жывёлагадоўлі.

Кадакас Н. Ю.
ЗАГАДЧЫК МАЛОЧНА-ТАВАРНАЙ ФЕРМЫ КАЛГАСА «УСХОД» (Туркаўскі сельсавет, Бабруйскі раён)

Азнаёміўшыся з пастановай пленума ЦК ВКП(б) аб паляпшэнні і развіцці жывёлагадоўлі, я, адразу зразумеў якое значэнне мае гэта пастанова. Асабліва мне па душы тое, што цяпер па жывёлагадоўлі ўводзіцца метад **планавання**, як у адносінах пасеўнага плана. На сваёй практыцы я адчуў, што значыць працаваць на ферме **па плану**. Мяне—старога батрака, члена партыі з 1918 года радуе што я чуццём сваім зразумеў, як трэба працаваць па-рэволюцыйнаму ў калгаснай гаспадарцы.

Каровы нашай фермы даюць больш малака, чым каровы нават лепшай пароды на іншых фермах. Вось, к прыкладу, на ферме калгаса імя Калініна большасць кароў чырвона-беларускай пароды, а даюць яны ў сярэднім у дзень 4 літры малака. У нас-жа — 6½ літраў у дзень. Няма слоў, што і нашы каровы даюць яшчэ мала, але калі параўнаць з мінулым годам (мяне на ферму перакінулі толькі з вясны сёлетняга года), то ўсё-ж мы дабіліся значных поспехаў. У мінулым годзе ў гэту пару ў сярэднім каровы давалі 2½—3 літры. За ўвесь 1933 год ферма дала 31 тыс. літраў, а з маім прыходам за 6 месяцаў каровы ўжо далі 31½ тыс. літраў малака, г. зн. павялічылі ўдой на 100 проц. Удой павышаецца з месяца ў месяц. Я ўзяўся давесці яго да 8 літраў у сярэднім, і не пралічуся ў гэтым.

Чаму я не пралічуся? Таму, што я дзейнічаю не ўслепую, а па строга абдуманаму **плану**.

Калі на нарадзе загадчыкаў ферм задалі пытанне тав. Федарэнчыку, загадчыку фермы калгаса **імя Калініна**, колькі ў іх у калгасе ўжо скошана сена і ці будзе забяспечан план сіласавання,—ён не змог адказаць на гэтыя пытанні. Па яго разуменню гэта справа паляводчых брыгад, якія косяць сена і закладваюць сілас. Ці не ясна, што гэты чалавек сляпы ў сваёй справе. Ён не ведае, чым будзе карміць кароў зімой. Ён не абмазгаваў і не склаў плана, як і дзе карміць кароў летам і таму ўжо ў чэрвені яго стада зменшыла ўдой да 4 літраў у дзень з каровы супроць 6 літраў у маі.

Райземаддзел даў нам план сіласавання—100 тон. Але на таму рацыёну, які я даю каровам, мне гэтага мала, а таму мы самі ў калгасе запланавалі 200 тон і план гэты выконваем. Праліку ў кармах быць не мажа, кожная карова атрымлівае кармы па вазе, у залежнасці ад сваёй жывой вагі і ўдойлівасці. Зараз, напрыклад, вярнуўшыся з пасьбішча, каровы вагой не менш 20 пудоў, якія даюць не менш 10 літраў (яны адносяцца да першай групы), атрымліваюць у дзень 7 кіло вікі на чадкорм; каровы другой групы атрымліваюць вікі 5 кіло; каровы 3-яй групы—4 кіло.

У планавым парадку вядзецца ў мяне і паляпшэнне пароды жывёлы.

Аплата працы на ферме з маім прыходам пастаўлена ў залежнасць **ад удою**. Даярка-скотніца, абслугоўваючая 1-ю групу кароў, якія даюць найвышэйшы ўдой, атрымлівае 3 соткі з літра, даярка 2-й групы—3¾ соткі з літра, даярка 3-й групы—3½ соткі. Пастух атрымлівае 1 сотку з літра.

Я ведаю, што ўлік—аснова ўсякага планавання. Без уліку не вытрымаць ніякага плана. Таму на ўлік я зварачаю асаблівую ўвагу. Кармы, удой, прыплод, якая карова калі злучана з якім быком, калі ацялілася і так далей і таму падобнае—усё ў мяне на ўлоце.

Не хвалячыся скажу—мяне перакідвалі ўжо не раз на фермы, якія знаходзяцца ў прарыве, і не было такой фермы, якую-б я не паставіў на ногі. Зноў паўтараю: тут галоўнае тое, што я не іду ўслепую, а дзейнічаю па строгаму плану.

Мой маленькі вопыт радавога члена партыі—наглядны прыклад, як правільна пленум ЦК нашай партыі паставіў пытанне аб дзяржаўным плане развіцця жывёлагадоўлі. Калі кожная ферма, кожны калгасны і аднаасобны двор будуць змагацца за планавую жывёлагадоўлю, — хутка застануцца ззаду ўсе недахопы і прарывы на жывёлагадоўчым фронце, па якіх указаў нам пленум ЦК ВКП(б) і ЦК КП(б)Б. Гэта ведае цвёрда стары батрак, зараз загадчык фермы калектыўнай гаспадаркі.

МІКАЛАЙ КАДАКАС.

Загадчык фермы калгаса «Ўсход», Бабруйскага раёна.

ВІТАМІНЫ ЗДАРОЎЯ

У Ленінградзе адбылася Усесаюзная вітамінная канферэнцыя, скліканая Акадэміяй навук і Наркамснабам СССР.

Канферэнцыя падвяла вынікі навукова-даследчых работ, праробленых за апошнія гады ў вітамінных лабараторыях і намеціла шляхі далейшай работы па забеспячэнню нашай краіны патрэбнымі вітамінамі.

Патрэба ў вітамінах расце з кожным годам. Яны неабходны для лячэння і прафілактыкі ад розных хвароб, якія выкліканы адсутнасцю таго ці іншага вітаміна ў харчаванні.

Асабліва вялікую патрэбу адчуваюць у вітамінах паўночныя краі і вобласці Савецкага Саюза, дзе галоўныя крыніцы вітамінаў—гародніна, зеляніна, плады і ягады — вельмі дрэнна растуць пры суровым клімаце.

У мэтах павелічэння нашых вітамінных рэсурсаў праведзена цэлы рад вопытаў па атрыманню вітамінаў з нехарчовых раслін.

Напрыклад, да апошняга часу адзінай крыніцай антыцынготнага вітаміна С з'яўляліся толькі расліныя харчовыя прадукты. Вопыты, праведзеныя ў нашых лабараторыях, паказалі, што ёсць поўная магчымасць атрымаць гэты вітамін з нехарчовых раслін—з сасны, ёлкі, адуванчыка, шыпоўніка, моху, батвы, морквы, бульбы, рэдыскі і інш.

Асабліва многа вітаміна С знойдзена ў сасне і ёлцы.

У даўнейшы час таксама адзінай крыніцай вітаміна А і антырахітнага вітаміна Д былі толькі рыбныя тлушчы, атрыманыя з пячонкі трэскі. Але пакрыць усю нашу патрэбу ў гэтых вітамінах з трэскавага тлушчу ніяк немагчыма.

Таму цяпер вывучаюцца вітамінныя ўласцівасці тлушчаў дэльфінаў, окуняў, усача, міногі, бялугі, цюленя, воблы, судака і інш. У гэтым напрамку ўжо ёсць буйныя дасягненні.

Прадэманстраваныя на канферэнцыі рад вітамінізаваных харчовых прадуктаў,—маргарын, мармелад, сухая гародніна, сіропы, кансервы, лікеры і інш.—гавораць аб тым, што гэта справа, якая мае вялікае значэнне для захавання здароўя працоўных мас нашай краіны, развіваецца вельмі хутка.

НАЙДУС.

САБАТАЖ СПРАВЫ БЕЛАРУСІЗАЦЫІ

(ГОРАЦКІ СЕЛЬСКА-ГАСПАДАРЧЫ ІНСТЫТУТ)

Барацьба з беларускім нацыянал-дэмакратызмам у горацкім **сельска-гаспадарчым інстытуце** мае асаблівае значэнне, бо тут дагэтуль яшчэ дашчэнту не вырваны карэнні нацдэмаўскай контрэволюцыйнай арганізацыі, якая на працягу раду год праводзіла шкодніцкі зрывала падрыхтоўку кадраў для соцыялістычнай гаспадаркі. Гэта арганізацыя мела такія-ж мэты, як Прышчэпаў, Масюкоў і інш., якія насаджвалі хутары, перашкаджалі калектывізацыі, спрыялі кулацкім элементам вёскі.

У снежні 1933 і студзені бягучага года, у сувязі з пастановамі ЦК КП(б)Б па нацпытанню, партарганізацыя інстытута правяла вялікую работу сярод студэнтаў і навуковых работнікаў па растлумачэнню сутнасці гэтых пастаноў. У часе распрацоўкі гэтых пастаноў мелі месца рад контрэволюцыйных вылазак астаткаў недабітай нацдэмаўшчыны (Рэндарт, Шчарбакоў, Шыжкевіч, Кудзін, Маргуноў і інш). Бязлітаснай барацьбой з гэтымі элементамі партарганізацыя мабілізавала ўвагу ўсіх студэнтаў на практычнае ажыццяўленне пастаноў партыі па нацыянальнаму пытанню. Рад навуковых работнікаў, якія раней чыталі лекцыі і праводзілі заняткі на рускай мове, пачалі чытаць іх на беларускай (Левін, Найдзёнаў, Каўчэвіч, Бейс і інш.), на першых курсах інстытута ўвялі выкладанне беларускай мовы і інш.

Але праз некаторы час аб прынятых пастановах забылі, праверкі выканання ні партком, ні іншыя арганізацыі інстытута не рабілі. У выніку ў інстытуце зноў ажывілася дзейнасць нацдэмакратычнага і шавіністычнага ахвосця.

Тыя выкладчыкі, якія перайшлі выкладаць на беларускую мову, зноў сталі выкладаць па-руску, а тыя, якія абяцалі хутка аўладаць беларускай мовай, нават не ўзяліся яе вывучаць да гэтага часу. Да іх у першую чаргу адносяцца тт. **Барысевіч** — дырэктар інстытута, **Іезуітаў** — нам. дырэктара інстытута, **Шасцярнёў** — нам. дырэктара па навучальнай частцы, **Школьнікаў** і інш.

Іменна таму, што справе супрацілення беларусізацыі патурае дырэкцыя, мы маем зараз такое становішча, што амаль ні адзін прафесар не чытае лекцыі па беларуску, што следам за імі беларускай мовай перасталі карыстацца ў сваёй рабоце і некаторыя маладыя навуковыя работнікі.

Адначасова ў **інстытуце актывізуюцца контрэволюцыйныя нацдэмаўскія элементы.** Студэнты **Стугароў, Буранкоў і Нярушкін** выступаюць супроць пастановы СНК аб спрашчэнні беларускага правапісу. Асістэнт **Прыбыткоўскі** агітуе студэнтаў: «хочаце, каб вас не звалі нацдэмамі — не вывучайце беларускую мову». На III курсе рабфака некаторыя групы дэманстратыўна не вывучаюць беларускую мову.

Партком інстытута ніяк не даў адпору антысеміцкай, нацдэмаўскай вылазцы выкладчыка-комуніста **Мараўнова.**

Дырэкцыя адкрыта выступае супроць беларусізацыі інстытута, піша дакладныя запіскі ў камітэт па вышэйшых навучальных установах, што БССР не можа забяспечыць інстытут студэнтамі, і таму трэба выкладаць па-руску, каб уцяць студэнтаў з Заходняй вобласці.

Гэтыя факты гавораць аб тым, што ў Беларускім сельска-гаспадарчым інстытуце з ажыццяўленнем нацпалітыкі партыі і інтэрнацыянальным выхаваннем студэнтаў і навуковых работнікаў справа пастаўлена зусім дрэнна. Тут патрэбны тэрміновыя меры.

«Звязда» ў сваім перадавым артыкуле ад 17 чэрвеня зусім правільна падкрэсліла, што «за апошні час сустракаецца рад абуральных фактаў ігнаравання беларусізацыі... што ва многіх партарганізацыях пытанні беларусізацыі знаходзяцца на задворках».

Гэта цалкам адносіцца да партарганізацыі горацкага Сельгасінстытута, а таксама і да ўсёй горацкай партарганізацыі. Аб гэтым сведчыць хоць-бы тое, што пленум РК, які адбыўся нядаўна, праходзіў выключна на рускай мове.

Горацкай партарганізацыі неабходна рашуча ўзяцца, не на словах, а на справе, за ажыццяўленне ленінскай нацпалітыкі, за правядзенне беларусізацыі і за інтэрнацыянальнае выхаванне мас студэнцтва і навуковых работнікаў, разгарнуць сапраўдную барацьбу з астаткамі контрэволюцыйнай нацдэмаўшчыны, як галоўнай небяспекі ў нацпытанні ў БССР, не аслабляючы адначасова барацьбу з праявамі шавінізма іншых колераў.

ЯНКА.

ГАЗЕТНЫЯ РАДНІ

БУДЗЕ І ЖЫЦЬ КУЛЬТУРНА

Пад такім загалоўкам у аддзеле «Перапіска знатных людзей» змяшчае «Палеская праўда» пісьмо брыгадзіра калгаса «Комсамол Гомельшчыны» тав. **Васіленка** да брыгадзіра Палесдрука тав. **Стучкова.** Васіленка апісвае ход работ у калгасе. Калгаснікі ў гэтым годзе пачнуць жыць заможна, яны атрымаюць на працадзень 3 кілограмы збожжа і 10 кілограмаў бульбы.

Калгаснікі хочуць жыць культурна.

«Мы аб'явілі ў сваёй брыгадзе паход за чыстую, культурную кватэру калгасніка, выпучылі спецыяльную камісію, якая-б кіравала гэтай справай, але як пачаць работу, мы добра не ведаем. Я ўношу прапанову, каб мае калгаснікі шляхам экскурсіі азнаёміліся, як жывуць рабочыя тваёй брыгады, а павучыцца ў рабочых як прывесці кватэру ў належны выгляд, нашым калгаснікам, я спадзяюся, ёсць чаму.

ПА 25 КІЛОГРАМАЎ ПШАНІЦЫ НА ПРАЦАДЗЕНЬ

Цікавая заметка змешчана ў газеце **«Биробиджанская звезда»** (Далёкаўсходні край). Калгас імя Анікеева, Ціханькоўскай МТС, з уборачнымі работамі спраўляецца паспяхова.

«Кожны калгаснік яшчэ з пачатку вясны ведае, колькі будзе важыць працадзень, калі калгас добра правядзе сельска-гаспадарчы год. Вось гэта і мабілізавала калгаснікаў на дружную работу.

— Дый як нам дружна не працаваць, — гавораць калгаснікі,— калі ў нас на кожны працадзень адной пшаніцы прыходзіцца па 25 кілограмаў».

КУЛЬТУРНЫ УЗДЫМ НЯМЕЦКАЙ ВЕСКІ У СССР *)

У капіталістычных краінах нацыянальныя меншасці прыгнятаюцца і нацкоўваюцца адна на другую. Асабліва ярка мы бачым гэта ў Германіі, у краіне заняпаду культуры. Там пануючыя зараз фашысты ўсімі сродкамі распальваюць расавую нянавісць. Яны стараюцца адурманіць працоўнае нямецкае насельніцтва і нацкаваць яго супроць яўрэйскай, польскай і інш. нацменшасцей, каб такім шляхам адцягнуць увагу ад надзвычай цяжкага ўнутранага становішча фашысцкай Германіі.

Інакш, зусім наадварот, — у Совецкім Саюзе, які правільна называецца радзімай працоўных усіх нацыянальнасцей усяго свята.

Окцябрская рэволюцыя вызваліла тут нацменшасці ад прыгнечання і жорсткай эксплаатацыі царызма і буржуазіі. Тут нацыянальным меншасцям совецкай улады даны ўсе правы. **Таксама і працоўнаму нямецкаму насельніцтву.**

Лепшым сведчаннем гэтага з'яўляецца нацыянальны нямецкі калгас імя **Розы Люксембург** у Ельскім раёне. Культурнае будаўніцтва ідзе тут гігантскімі крокамі ўперад. Тут уведзена ўсеагульнае навучанне, і старая школа, якая ўжо не магла задаволіць прад'яўляемых ёй патрабаванняў, перабудавана ў маі гэтага года ў сямігадовую школу. Школа мае цяпер тры вялікія і тры сярэднія велічыні пакоі, настаўніцкую і двор.

У гэтым годзе пабудавана яшчэ амбулаторыя, дзіцячыя яслі і чытальня, у якой ёсць багатая бібліятэка і радыё-пакой. **8 разоў у месяц выходзіць раённая газета з нямецкай стороннкай.** У ёй абмяркоўваюцца ўсе патрэбы і задачы калгаса.

У якой-жа яшчэ іншай краіне маленькая нацыянальная меншасць у раёне мае сваю газету? Нідзе, ні ў якой іншай краіне свету!

У сельска-гаспадарчай галіне калгас імя Розы Люксембург таксама мае добрыя поспехі. Раней калгас быў на чорнай дошцы. **Але зараз ён ідзе ў раёне першым і ўжо пэўны час трымае пераходны раённы сцяг за добрае выкананне планаў па соцыялістычнаму спаборніцтву.**

Калгас **«Шлях рэволюцыі»** — інтэрнацыянальны калгас — умацоўваецца штодзённа, ён павялічвае ўсё больш сваю плошчу пабудоў, а таксама і стада буйнай рагатай жывёлы. **Зараз там совецкая ўлада праводзіць меліярацыю.** На меліярацыі працуюць дзве арцелі маладых рабочых калгаса. Гэтадзе ім магчымасць павышаць сваю кваліфікацыю і падрыхтоўваецца да работы ў прамысловасці. Калі меліярацыя будзе закончана, калгас атрымае сотні гектараў добрай зямлі.

Усе гэтыя поспехі з'яўляюцца рэзультатам правільнага правядзення ленінскай нацыянальнай палітыкі ў БССР Цэнтральным Камітэтам КП(б)Б на чале з тав. **Гікало.** КП(б)Б аказвае нацыянальным нямецкім калгасам ў БССР велізарнейшай увагай і падтрыманнем.

Толькі ў Совецкім Саюзе ёсць сельска-гаспадарчы і культурны ўздым працоўных, толькі тут расце культурны і матэрыяльны ўзровень працоўных немцаў. У фашысцкай Германіі—працоўнае нямецкае сялянства асуджана на дэградацыю, голад і выміранне.

Няхай жыве адзінства і брацтва працоўных усіх нацыянальнасцей СССР і ўсяго свету!

ГЕРМАН ПЕТЧ.

*) Аўтар артыкула — немец — рабочы завода імя Варашылава, які пабываў нядаўна ў нямецкіх калгасах Ельскага раёна.



ПОМНІК ЛЕНІНУ Ў БАРЫСАВЕ.

МАШЫНІСТ СЦЯПАН ЛАЎРЭНАЎ

—Наша жняярка працуе на дзіва,—заяўляюць калгаснікі калгаса імя Варашылава, Крычаўскага раёна. І сапраўды, у калгасе з 72 гектараў жыта жняяркай зжалі 51 гектар. **Жняярка ў сярэднім штодня выпрацоўвала па 6,4 гектара, а былі дні, калі зжынала і па 7,3 гектара.**

І хочацца зараз-жа расказаць пра машыніста Сцяпана Лаўрэнава, раскрыць яго «сакрэты» ў рабоце на жняярцы. Але ці сакрэты гэта? Сам Сцяпан не бачыць у сваёй рабоце ніякіх сакрэтаў. Пытаеш яго, чаму гэта іншыя машыністы не могуць зжаць і трох гектараў, а ён выжынае больш сямі. На гэта Сцяпан адказвае проста:

— Ну, якія тут могуць быць сакрэты?... Працую як належыць, вось і ўсё.

І толькі слова за словам удаецца высветліць і раскрыць, калі іх можна так назваць, «сакрэты» яго работы. Яны простыя і незадачлівыя, як сам Сцяпан. Пра іх можна было-б сказаць паўдзесяткам слоў: **чэсна адносіцца да працы і любіць яе. Вось і ўсё.**

Сцяпан палюбіў жняярку і цесна з ёю зрадніўся.

У тры гадзіны раніцы Сцяпан выязджае на жніво. З вечара ў жняярку закладзен востры нож, жняярка змазана, праверана работа асобных частак. У 10-11 гадзін дня прыводзяць парку зменных коней, мяняюць нож. У 3 гадзіны прыходзіць падменны Пілін ці Міхась. Жняярка працуе бесперабойна. У 4-5 гадзін таксама мяняюцца коні і нож. Жняярка працуе да 11 гадзін вечара.

Галоўнае пры рабоце: чоткая работа машыністаў, добра падкормленыя коні, своечасовая змазка, падцінчванне аслабшых гаек, прачыстка. Захоўваючы, здавалася-б элементарныя, гэтыя правілы, жняяркі і пачалі сістэматычна перавыконваць устаноўленую норму.

***

Зараз Сцяпан жне яравыя. На полі лёгкі шэлест залацістага аўса заглушае напорыстае стракатанне жняя жняяркі. Праз тры крылы чацвертае са стала правільна скідае вяршок да вяршка, кошаль да кошаля. Звяжы сноп, дык не пазнаеш чым ён зжат—сярпом ці жняяркай. А людзі прывыклі думаць, што, даючы вялікую колькасць выпрацоўкі, нельга даць добрую якасць. Працуючы на жняярцы, якраз атрымліваецца наадварот. Хто дае найлепшую якасць, той больш і выжынае. Пачне жняярка клычыць збожжа, нярэўна скідаць, машыніст будзе раз-поразу спыняць яе, ход яе стане цяжкім, коні хутка зморацца. Гэтага Сцяпан пазбавіўся, бо жняярка своечасова змазваецца, правяраецца работа частак, якія прачышчаюцца. Ёсць добрая якасць, ёсць і вялікая колькасць выпрацоўкі.

У гэтым, мусіць, і «сакрэт» работы машыніста Сцяпана Лаўрэнава.

М. ВІШНЕЎСКІ.

Крычаў.

Калгас імя Кліма Варашылава.

Х. ДУНЕЦ

ДЗВЕ РАДЗІМЫ

Рабочыя і працоўныя беларусы, яўрэі, палякі і іншых нацыянальнасцей, насяляючыя Совецкую Беларусь, радасна віталі пастанову совецкага ўрада аб ператварэнні Біра-Біджанскага раёна ў Яўрэйскую аўтаномную вобласць. Гэта пастанова совецкага ўрада і партыі з'яўляецца яшчэ адным бліскучым доказам таго, што краіна Совецтаў ёсць сапраўдная і адзіная радзіма ўсіх працоўных, радзіма, якая, як маці, клапоціцца аб патрэбнасцях працоўных усіх нацыянальнасцей, і знаходзіць шляхі да развіцця соцыялістычнай творчасці і соцыялістычнай культуры ўсіх народаў у адпаведнай нацыянальнай форме.

◆

Буржуазія не раз прабавала падпімаць на шчыт «нацыянальнае пытанне» і ім жанглірваць. Гэта рабілася, у прыватнасці, таксама ў адносінах да яўрэйскай нацыянальнасці.

Сіяніізм, які эксплааціраваў на працягу доўгіх дзесяткаў год адсталасць яўрэйскіх дробна-буржуазных мас, іх нацыяналістычныя ілюзіі, які прынёс на працягу гэтых год у ахвяру англійскаму імперыялізму нядзейсненыя надзеі лёгкаверных элементаў яўрэйскага насельніцтва,—сіяніізм на сваім сцягу напісаў лозунг: «да радзімы». Заклікаючы да «ціхай гаваці», да «уласнага кутка» ў «яўрэйскай краіне», «краіне бацькоў», сіяністы фактычна заклікалі яўрэйскія масы добраахвотна аддацца ў рукі англійскім каланізатарам, ператварыцца ў аброю нажывы яўрэйскіх кулакоў, у аброю шавіністычнай бойні, братазабойчых крывапраліцяў на палях «святых айцоў».

Сіяністычны лозунг «да радзімы» прыцыпова базаваўся на буржуазных нацыяналістычным прынцыпе абароны ўласнай нацыянальнай буржуазіі, на абагачэнні за лік працоўных. У гэтых мэтах сіяніізм падгукі нацыяналістычнага гімна «Эйдлей овдо» («Не страчана надзея») мабілізоўваў моладзь для каланізацыі Палестыны.

Да якіх рэзультатаў прывёў сіяністкі лозунг «да радзімы»? Аб гэтым не шкодзіць напомніць у сувязі з рашэннем аб Біра-Біджане.

Мы перагортваем першую, трапіўшую нам у рукі, кніжку *), якая апісвае становішча эміграваўшых у Палестыну яўрэйскіх каланістаў. Чытаем:

«Калонію «Мішмер Гаярдэн» («Стража Іордана») мясцовыя яўрэі пачалі будаваць пры дапамозе рускіх «прыхільнікаў Сіона». 2-3 ветхія хаціны, маленькі і спустошаны кавалак зямлі, закіданы каменнямі і церніем, які знаходзіцца сярод балот Іордана — і перад намі калонія з гучнай назвай «Мішмер Гаярдэн». Потым ужо «ЕКО» (Яўрэйскае каланізацыйнае таварыства) дакладзяліла каланістаў зямлёй і пабудавала дамы. Але гэта «дабаўка» таксама была недастаткова, і калонія цягне сваё існаванне напалову за кошт французскага «падтрымання» і напалову за кошт Цфаскай «падачкі».

Каланісты не маюць права распараджацца ні ў сваёй калоніі, ні на палях або ў агародзе, і нават у сваёй уласнай хаце. Рабы ў сваёй уласнай «яўрэйскай радзіме»—вось чым былі і астаюцца яўрэйскія працоўныя, якія перасяліліся ў «свяшчэнную краіну». Яны самі становяцца зброяй ганення слабых народнасцей і гэтым ставяць сябе ў становішча аб'екта варожасці і пастаянных нападак.

«Друзы з Метулы,—чытаем мы ў дакумэнце, апісваючым каланізацыю Палестыны,—**вельмі бедныя, і калі іх выгналі з вёскі, яны адразу апынуліся ў надзвычай цяжкім становішчы, хоць кожны з іх атрымаў па некалькі сот марак. І яшчэ адно: пасля таго, як яны пакінулі сваю калонію, якая вызначалася свэім здаровым і прыемным паветрам, яны знайшлі часовы прытулак у Друзскай вёсцы, у даліне Хаэлес—на поўнач ад Мэй-Меройм, дзе лютуе балотная ліхаманка, і такім чынам многія з іх захварэлі гэтай хваробай... Таму яны пачалі пагражаць жыхарам калоніі і аднойчы стрэлілі ў адзін з домоў. Аднаго разу яны напалі на [illegible] спаўшага ў сваім свірне, і [illegible] яго, а аднаго разу [illegible] у вялоў у каланіста, працзваўшага [illegible] поле».**

Такавы «нацыянальны мір» [illegible] «яўрэйскай радзіме», якая будавалася сіяністамі і знаходзіцца пад пратэктаратам Англіі.

◆

Зусім іншую карціну мы бачым у нашай соцыялістычнай радзіме. Пролетарская рэволюцыя ўдарыла па шавінізму, краіна Совецтаў стала жывым увасабленнем інтэрнацыяналізма і сапраўднай свабоды працоўных усіх нацыянальнасцей. Сіяніізм ва ўсіх яго формах атрымаў смяротны ўдар, ад якога яму ўжо ніколі не ўдасца аправіцца.

Сіяністы і шавіністы розных масцей ставілі стаўку на зруйнаванасць мястэчка. Яны цвердзілі: беднае мястэчка гаспадарча не можа быць адноўлена. Гэта карта яўрэйскіх шавіністаў біта, і партыя разаблачыла ўсіх шавіністаў і апартуністаў, спекуляваўшых на гэтай спадчыне царызма.

Мястэчка зараз набыло другое аблічча, змяніўся яго жыццёвы стыль. Мястэчка Шлойме-багацея пайшло ў нябыт, канула ў вечнасць фігура патрыярхальнага ўсясільнага рабіна. Ёсць **новае мястэчка**—мястэчка кааператываў, школ, калгасаў, самаўтужных арцелей, МТС, млыноў і лесазаводаў, мястэчка новых знатных людзей—ударнікаў і ўдарніц—партыйцаў і комсамольцаў, калгаснікаў і кааператараў, настаўнікаў і агрономаў. Няма ўжо яўрэйскай беспрацоўнай моладзі і дэкласаваных непрадукцыйных элементаў—замест іх вырасла армія «фабзайцаў», рабочых вугальных копей, металістаў, транспартнікаў, будаўнікоў, механікаў, электрыкаў, тэхнікаў, кааператараў, самаўтужнікаў, інжынераў. Вырасла яўрэйская пролетарская літаратура, выраслі яўрэйскія кадры [illegible] пісьменнікаў, [illegible] артыстаў, [illegible]

Толькі на фоне гістарычных перамог партыі і совецкай улады ў соцыялістычнай рэканструкцыі ўсяго СССР былі магчымы гэтыя дасягненні ў галіне соцыялістычнага ператварэння жыцця рабочых і працоўных мас яўрэйскай нацыянальнасці. На гэтым фоне паўстае ва ўсёй велічы значэнне пастановы аб стварэнні аўтаномнай Яўрэйскай вобласці ў Совецкай краіне. Гэта—яшчэ адзін бліскучы доказ, **што СССР з'яўляецца радзімай усіх працоўных, што толькі ў краіне пролетарскай дыктатуры магчыма поўная ліквідацыя астаткаў прыгнечання нацыянальнасцей, рост і росквіт соцыялістычных па зместу нацыянальных культур.**

◆

Пастановай аб Біра-Біджане яўрэйскі нацыянал-сепаратызм атрымаў яшчэ адзін смяротны ўдар. Чаго варты ў святле гэтага факта гутаркі аб «дэяўрэізацыі» і інш.! Цесная сувязь яўрэйскіх рабочых і калгаснікаў са сваімі братамі іншых нацыянальнасцей, перасяленне ў Крым і Біра-Біджан на аснове брацкага супрацоўніцтва працоўных усіх нацый, рост яўрэйскай культуры,—нацыянальнай па форме і інтэрнацыянальнай па свайму духу,—усё гэта з'яўляецца процідзеем яўрэйскаму шавінізму, зброяй супроць апартуністаў, якія недаацэньваюць небяспеку яўрэйскага нацыяналізма, імкнуцца змазаць яе, «даказваючы», што, моў, яўрэйскі шавінізм «па сутнасці сваёй з'яўляецца выключэннем з агульнага правіла».

Біць па галоўнай крыніцы нацыянальных ухілаў—па адыходу ад ленінскага інтэрнацыяналізма—з'яўляецца важнейшай задачай у барацьбе за соцыялістычны Біра-Біджан, дзе яўрэйскія масы жывуць і працуюць у шматнацыянальнай сям'і Далёкага Усхода. Практыка ўжо даказала, што пры ўсіх асаблівасцях і труднасцях, якія сустракаюцца на шляху ажыццяўлення гэтай задачы, яна ператвараецца ўжо ў факты. Кітаец, карэец, украінец, яўрэй, тунгус, рускі, беларус—усе яны салідарна працуюць, бо яны аб'яднаны ідэяй соцыялістычнага будаўніцтва і соцыялістычнай радзімы. Будаўніцтва соцыялізма ліквідуе нацыянальную абмежаванасць, зблізкае рабочых і працоўных розных нацыянальнасцей. Для доказу прыводзем адзін з шматлікіх фактаў:

«На трыбуне сустрэліся два старыя ўдарнікі: 60-гадовы Юн-Пей-гу з карэйскага калгаса «Карл Лібкнехт» і наш стары знаёмы, біраібіджанскі піонер, 55-гадовы калгаснік з калгаса «Валдгейм», Лейба Гефен.

Вось стаяць яны адзін супроць другога—два ўдарнікі.

Лейба Гефен расказвае аб сваёй рабоце ў часе сяўбы, аб труднасцях, якія прышлося перамагчы калгасу «Валдгейм».

— «Сеялка стала,—расказвае Гефен,—часу мала, кожная мінута дорага. Узяў я праз галаву на рамень лукошка з насеннем і пашоў дарога. Узяў я праз галаву на рамень лукошка з насеннем і пашоў рукамі сеяць, і засеяў больш, чым два маладых разам...».

Лейбе Гефен аблцае ва ўборку яшчэ лепш працаваць і паказаць моладзі, як трэба працаваць...

— Выклікаю на соцспаборніцтва майго таварыша з калгаса імя Лібкнехта—Юн-Пей-гу.

Юн-Пей-гу не разумее яўрэйскай мовы. Твар яго застаецца нерухомым. Яму перакладаюць выклік Гефена на рускую мову. Юн-Пей-гу не разумее рускай мовы. Халодным і спакойным застаецца яго твар. Тады перадаюць яму па-карэйску гефенскую прамову. Шырэй і мягчэй робіцца твар Юн-Пей-гу. У яго вузкіх вачах запальваецца агеньчык і па старому твару расплываецца цёплая ўхмылка.

Юн-Пей-гу адказвае па-карэйску:

— Мой калгас добра селу і перамог. У мяне ўжо выпрацаваных 200 працадзён, у часе ўборкі буду працаваць яшчэ лепш. Выклік Лейбы Гефена прымаю...

Так быў заключан дагавор на соцспаборніцтва паміж двума ўдарнікамі біраібіджанскіх соцыялістычных папёў—паміж яўрэйскім калгаснікам Лейбай Гефенам і карэйскім калгаснікам Юн-Пей-гу.

Цёплае пачуццё інтэрнацыянальнай салідарнасці і брацтва ахапіла ўсіх прысутных і „бурна праірвалася громам апладысментаў *).

У гэтых новых рысах соцыялістычнага быту Біра-Біджана—адзінадушнасці і рэволюцыйнай пільнасці на граніцах СССР з імперыялістамі на Далёкім Усходзе.

Працоўныя Біра-Біджана будуць гатовы даць па зубах буржуазіі і ўсім яе агентам, якія прабуюць пад нацыянальнай маскай распаўсюджваць нацыяналістычны яд. Мы падкрэсліваем барацьбу з нацыяналізмам, як задачу абароны нашай совецкай радзімы, бо ў нядаўнім мінулым мы перажылі новы ўрок класавай барацьбы па Украіне і ў Беларусі, урок, які паказаў нам, як мясцовы шавінізм на пэўным этапе ператварыўся ў дзяржаўную небяспеку, быў скарыстан сіламі інтэрвенцыі. Мы ўпэўнены, што ў сям'і народаў СССР Яўрэйская аўтаномная вобласць зможа скарыстаць багаты вопыт нашай партыі ў яе барацьбе супроць контрэволюцыйнага нацыянал-дэмакратызма і здаць рашучы адпор гэтаму ворагу, калі ён напрабуе актывізавацца.

*) Б. КОБЛЕНЦ «Вальдгейм», Масква 1934 г.

ЗВЯЗДА 3

УСЕБЕЛАРУСКІ ВЫТВОРЧЫ ПАХОД ІМЯ ТАВ. ГІКАЛО

СУШЫЦЬ ТОРФ ТАК, ЯК БРЫГАДА ГАРБАЧОВАЙ

Здалёку чутна бадзёрая песня маладых тарфяніц. Тут працуе брыгада **Панцюшовай.**

13 дзяўчат завіхаюцца каля невялічкіх клетак прасушанага торфу. Поўныя кошыкі хутка запаўняюцца і выносяцца да штабелёў. Раскладальшчыца **Пяткова** старанна, роўнымі пластамі ўкладвае лёгкія цаглины.

Парожнія кошыкі зноў запаўняюцца торфам. Штабель расце з кожнай хвілінай усё вышэй і вышэй.

Няма таго дня, каб брыгада выканала сваю норму менш чым на 170-180 проц.

Побач працуе брыгада **Пятрэнкі.** Увесь час яна адстае, не выконвае сваё заданне.

— Узялі мы яе на буксір,—кажа **Панцюшова.**—У працэсе работы мы дапамагалі ім правільна класці штабелі, паказвалі як трэба браць торф, падносіць яго і т. д. **Зараз брыгада Пятрэнкі ўжо выконвае сваю норму».**

Лепшыя ўдарнікі брыгады: **Пяткова, Балбукова, Хурэва** даюць кожны дзень 200 проц. свайго задання.

За апошні час брыгада **Гарбачовай** (2-гі ўчастак) абагнала **Панцюшову** і атрымала пераходны чырвоны сцяг.

Брыгада **Гарбачовай** дае штодзённа па 200-218 проц. свайго задання. Усе 14 тарфяніц брыгады заключылі паміж сабой соцспаборніцтва. Прапрацавана інструкцыя па сушцы і ўборцы торфу.

Кожны дзень брыгада выходзіць на работу з адзінай думкай: даць сёння больш чым учора. Добраасумленнымі адносінамі да работы невялічкая, але загартованая, брыгада **Гарбачовай** паказала перад усімі тарфяніцамі Беларусі, як патрэбна змагацца за найхутчэйшае выкананне плана па асушцы і ўборцы торфу.

І. РУТ.

Завод «Большэвік».

ВОПЫТ КУРАНЁВА— У ПРАКТЫКУ НАШАЙ РАБОТЫ

(АД СПЕЦЫЯЛЬНАГА КАРЭСПАНДЭНТА «ЗВЯЗДЫ»).

На тарфяным заводзе «ДУКОРЫ» шырока разгарнулася прапрацоўка даклада лепшага брыгадзіра-тарфяніка БССР тав. КУРАНЁВА.

Брыгады Церахава і Акімцава ўскрылі ў сваёй рабоце цэлы рад недахопаў, на якія ўказваў у сваім дакладзе тав. КУРАНЁЎ.

Тарфяніки ў сваіх выступленнях адзначылі, што даклад тав. КУРАНЁВА будзе для іх баявой праграмай у штодзённай рабоце.

Я.

ЗЛАЧЫННЫЯ АДНОСІНЫ ДА ФРЭЗЕРНАГА ТОРФУ

Белдрэс павінен быў атрымаць з Асінторфа за чэрвень і ліпень 6.060 вагонаў торфа. План гэты выканан на 5 жніўня толькі на 45 проц. Перавозіцца за дзень 60-70 вагонаў замест 120. З 5 жніўня перавозка спынена. Белдрэс, які адказвае за гэта, мала аддае ўвагі перавозцы.

Торф перавозіцца ў непрыстасаваных вагонах. Фрэзерны торф адгружаюць у тых-жа ваганетках, што і кускавы торф. У выніку—на дарозе з Асінторфа да Белдрэса губляецца 25 проц. торфу.

Захоўваецца торф на Белдрэсе вельмі дрэнна; ён складаецца пад адкрытым небам.

М. ФРУМКІН.

МАРУДНА І ДРЭННА

Тэмпы торфаздабычы на заводзе «Міхалавічы» за апошнія дні значна зніжаюцца. Калі 29 ліпеня было здабыта 156.684 цаглины, то 30 ліпеня 147.678 цаглін, 31-га—141.484, а 1 жніўня яшчэ менш —134.254 цаглины. З пяці брыгад сезоннае заданне выканала адна.

Тлумачыцца гэта слабасцю працоўнай дысцыпліны, адсутнасцю кіраўніцтва, частымі прастоямі.

На заводзе дзейнічаюць шкодніки. 30 ліпеня машыніст **Барысёнак** (машына № 2) свядома залажыў болт у прэс. Рамонт заняў цэлую гадзіну. Заводскія арганізацыі не ўзнялі гэтага факта на прынцыпова палітычную вышыню.

Сушка торфу праходзіць дрэнна. Заштабелявана на 1 жніўня **4.124** тоны—42 проц. здабытага торфу. Астатні торф знаходзіцца ў першых працэсах сушкі (рассці і малыя клеткі). Сушка дрэнная, штабелюецца з вільготнасцю каля 70 проц.

Балота не падрыхтавана да сушкі. Поле вельмі вільготнае. Картавых канаў праведзена недастаткова. Сушкай торфу кіруюць тэхнічна непісьменныя людзі (**Падзбед і Шэлег**). Не ўмеюць зрабіць падлік зробленай работы. Дрэнна расстаўлены рабочыя.

Дырэктар завода **Пэўны** самаўспакоена заяўляе, што «план у гэтым годзе завод выканае». Але ход работы завода прымушае рабіць адваротныя вывады.

М. ЯРЧАК.

Фота ЛОСЕВА (Віцебск).

Брыгада рабочых абутковай фабрыкі імя Лекерта (Віцебск) вывучае дэталі рантавай машыны.

ПІЛЬНА АХОУВАЦЬ РЭВОЛЮЦЫЙНУЮ ЗАКОННАСЦЬ

З выступлення нам. пракурора Саюза ССР тав. ВЫШЫНСКАГА на з'ездзе работнікаў юстыцыі*)

Моцная працоўная дысцыпліна і нашана совецкіх законаў—вось асноўнае, што патрабуецца ад работнікаў юстыцыі, ад работнікаў суда, пракурора, следчага і т. д. Свавольства і пролетарская дысцыпліна—гэта дзве рэчы, якія адна другую выключаюць. Трэба паважаць совецкія законы, нельга да справы падыходзіць адвольна.

Мы маем такія выпадкі, калі работнікі суда, пракурор, следчы ведаюць толькі аб існаванні таго ці іншага артыкула Крымінальнага кодэкса, таго ці іншага артыкула совецкага закона, але не ведаюць сутнасці гэтага закона, рэвалюцыйнага сэнсу гэтага закона. Больш таго, назіраюцца выпадкі, калі справу праводзяць, так сказаць, кавалерыйскім алюрам. Трэба, напрыклад, правесці тую ці іншую справу, а работнік, які займаецца гэтай справай, не ўваходзіць у яе сутнасць, не афармляе яе, вырашае пытанне наскокам, непрадумана, парушае ўсе фармальнасці.

Асобныя работнікі лічаць, што фармальнасць не трэба захоўваць, што гэта не дапамагае справе і т. д.

Тав. Вышынскі адзначае, што паміж фармалізмам і фармальным патрабаваннем вялікая розніца, што тыя фармальныя патрабаванні, якія павінны быць у справе, неабходна выканаць, што ніякае свавольства ў судовай практыцы не можа быць дапушчана.

Далей тав. Вышынскі падкрэслівае тую велізарную дапамогу, якую аказвае партыя органам юстыцыі і спыняецца на значэнні рэформы, праведзенай зараз у органах пракуратуры суда.

Тав. Вышынскі адзначае, што яна праведзена для таго, каб пабольшэвіцку, сумленна і самааддана яшчэ больш змагацца за сапраўднае правядзенне рэвалюцыйнай законнасці.

Задача заключаецца ў тым, каб узняць якасць работы судоў і пракуратуры, яшчэ больш мабілізаваць сілы на барацьбу супроць парушальнікаў рэвалюцыйнай законнасці, супроць ворагаў народа, на барацьбу за ахову рэвалюцыйнай законнасці, совецкіх законаў.

Галоўнае ў перабудове работы органаў суда і пракуратуры заключаецца ў праверцы і яшчэ раз у праверцы ўсяго апарата з верху да нізу.

Перад органамі суда і пракуратуры ў сувязі з арганізацыяй Народнага Камісарыята Унутраных спраў стаяць асабліва вялікія задачы. Роля суда ўзнімаецца на яшчэ большую вышыню. Павялічваюцца правы і абавязкі народнага суда. Аднак, у асобных нашых судах назіраюцца факты неразумення законаў, павярхоўны падыход да справы, нядбайнае афармленне спраў. Тав. Вышынскі ілюструе свае словы фактамі няправільных адносін і неразумення ролі народных засядацеляў.

Узняць на яшчэ большую ступень ролю народнага суда, шырока разгарнуць работу грамадска-таварыскіх судоў у сельсоветах, калгасах, працаваць з актывам органаў юстыцыі, больш правільна афармляць справы, глыбей і сур'ёзней уваходзіць у кожную справу —вось што патрабуецца.

Спыняючыся на ролі пракуратуры, пракурора, тав. Вышынскі адзначае, што неабходна рашучым чынам перабудаваць работу агульнага нагляду. Агульны нагляд ажыццяўляць значна лягчэй, чым кіраваць канкрэтна. Лёгка праехацца па калгасах, паглядзець што там і як там і нічога не зрабіць. Пракурор павінен сам займацца справай, глыбока ўвайсці ў сутнасць справы, больш канкрэтна, аператыўна займацца кожнай справай.

Ёсць факты, калі пракуроры амаль не выступаюць у судзе, а толькі потым, азнаёміўшыся са справай, апратэстоўваюць яе або санкцыянуюць. Такога становішча ў далейшым дапускаць нельга. Пракурор абавязан прымаць удзел у падрыхтоўцы справы. Ён павінен выступаць на асноўных судовых працэсах, бо ў гэтым заключаецца канкрэтная задача для пракурора. Паменш трэба вазіцца з паперамі.

Трэба раз і назаўсёды адмовіцца ад той няправільнай думкі, якая існуе сярод многіх пракураў, аб тым, што ён в'яўляецца гаспадаром працэса. Не, гаспадаром працэса з'яўляецца суддзя, а ён, пракурор, толькі старана, прымаючая ўдзел у працэсе.

Трэба раз і назаўсёды запамятаць, што суд мае справы з фактамі. На аснове фактаў павінна вырашацца справа, павінен быць вынесен прыгавор. Факты ва ўмовах разгляду справы, ва ўмовах захавання рэвалюцыйнай законнасці павінны адыграць рашаючую ролю.

Далей тав. Вышынскі выкрывае рад недахопаў у пракурорскай практыцы. Бываюць выпадкі, што калі пракурор не ўваходзіць у факты, а толькі глядзіць на паводзіны падсудкага. Калі падсудны маўчыць, значыць вінават, ён павінен быць прыцягнут да адказнасці. Ну, а калі падсудны хвалюецца, то пракурор выходзіць з пастуцных меркаванняў: ён вінават, ён баіцца выдаць свае злачынства, значыць ён таксама павінен быць прыцягнут да адказнасці. А калі падсудны трымае сябе на судзе спакойна, хладнакроўна, адчувае сваю невіннасць, пракурор робіць вывад, што ён мае справу з закаранелым злодзеем. А калі-ж падсудны трымае сябе непрымушана, шмат балбоча, то пракурор лічыць, што гэты чалавек ужо прайшоў агонь і ваду, ён замятае свае сляды, і ён таксама вінават. Да такога погляду на падсудных прыводзіць тое, што некаторыя пракуроры лічаць, што паколькі я яго абвінавачу, паколькі ён пасаджан на лаву падсудных, значыць ён вінават. Апраўдаць яго, значыць дапусціць лібералізм.

Такія моманты трэба выкараняць.

Тав. Вышынскі гаворыць, што паасобныя пракуроры, следчыя і народныя суддзі яшчэ не ўлічылі ўказання таварыша Сталіна аб тым, што класавы вораг перабудоўваўся, што ён пралазае вужам, дзейнічае «ціхай сапай». Пры разглядзе кожнай справы трэба знайсці галоўнага вінаватага і накіраваць на яго галоўны ўдар, умець адрозніваць класавага ворага ад таго чалавека, які зрабіў злачынства несвядома. Знайсці ворага, выцягнуць яго з цёмнай шчыліны і на яго накіраваць галоўны ўдар — гэтага яшчэ, на жаль, многія не разумеюць. Зачастую нашы работнікі юстыцыі забываюць аб фактах, не ўлічваюць акалічнасцей.

Перад многімі работнікамі юстыцыі стаіць задача — вучыцца, вучыцца і яшчэ раз вучыцца, быць палітычна граматнымі, класава пільнымі.

Затым тав. Вышынскі гаворыць аб рабоце міліцыі і аб рабоце следчых. Ёсць факты, калі органы і работнікі міліцыі парушаюць рэвалюцыйную законнасць, з чым трэба рашуча пакончыць.

Надзвычай вялікую ўвагу павінен аддаць Наркамюст БССР пытанням работы следчага. Следчы павінен быць вызвалены ад удзелу ў арганізацыі нагляду. Следчы павінен перабудаваць сваю работу пад кутом гледжання большага, глыбейшага ўваходжання ў дэталі справы.

Неабходна, адзначае тав. Вышынскі, аднавіць распарадзіцельныя нарады, наладзіць іх работу, бо ў распарадзіцельных нарадах лепш разгледзець якасць абследвання, лепш разгледзець якасць справы.

Закончваючы свой даклад, тав. Вышынскі спыняецца на масавай рабоце, на ўцягненні ў работу юстыцыі грамадскіх абвінаваўцаў, лепшых ударнікаў прадпрыемстваў і калгасаў. Неабходна арганізаваць канферэнцыі грамадскіх абвінаваўцаў, прапрацаваць з імі некалькі спраў. Трэба апірацца на групы садзейнасці, кантрольныя пасты, трэба прывучаць іх да работы, патрабаваць таксама ад іх канкрэтнай справы, трэба навучаць іх палітычна, тэхнічна граматна разбірацца ў справах, прыцягваць іх да ўдзелу ў рабоце судоў і пракуратуры.

Тыя недахопы, якія ёсць у рабоце паасобных органаў юстыцыі, трэба неадкладна зжыць.

Партыя нам дала загад цвёрда і моцна стаяць на варце рэвалюцыйнай законнасці і на гэты загад партыя павінна атрымаць адзіны адказ: ЕСЦЬ, БУДЗЕ ВЫКАНАНА!

*) Падаецца па жывому запісу.

ПІСЬМЫ РАБОЧЫХ І КАЛГАСНІКАЎ

УПАЎНАВАЖАНАМУ НАРКОМЛЕСА ПА БССР ТАВ. РОЗІНУ.

ДЛЯ БАБРУЙСКАГА ШПАЛАРЭЗНАГА ЗАВОДА ЗАКОНЫ НЕ ПІСАНЫ

(ПІСЬМО РАБОЧАГА)

На бабруйскім шпаларэзачным заводзе да гэтага часу не праведзена павышэнне зарплаты рабочым згодна закона ўрада аб падцягванні зарплаты нізкааплачваемай групы рабочых.

Такое становішча адміністрацыя завода і заводскі камітэт тлумачаць тым, што нібы пастанова гэта на шпаларэзачны не распаўсюджваецца (!?).

Дрэнна пастаўлена **снабжэнне.** За ліпень рабочыя зусім не атрымалі хлеба. Абеды ў сталовай дрэнныя. Зарплата выдаецца не рэгулярна. Яшчэ за ліпень рабочыя не атрымалі нават аванса ў.

Упаўнаркомлеса, у веданні якога гэты завод, зусім не цікавіцца заводам, не кіруе ім.

С. ГАРОХ.

СТАРШЫНІ ЛЁЗНЕНСКАГА РВК ТАВ. ШУЛЬГА.

КАЛІ Я АТРЫМАЮ РАЗІ І?

(ПІСЬМО АД ДЭМАБІЛІЗАВАНАГА ЧЫРВОНААРМЕЙЦА)

Да ўходу ў Чырвоную армію, у 1931 годзе, я працаваў у калгасе «Інтэрнацыянал», Лёзненскага раёна, брыгадзірам комсамольскай брыгады. Выпрацаваў 225 працадзён. У гэтым-жа годзе мяне прызвалі ў Чырвоную армію. Калгас тады са мной не разлічыўся, таму што не быў абмалочан увесь ураджай.

Будучы ў Чырвонай арміі, я не раз пісаў пісьмы ў калгас і прасіў, каб яны разлічыліся за выпрацаваныя мной працадні. Але гэта не дапамагло. Вярнуўшыся з арміі, я зноў не раз звярачаўся да праўлення калгаса і асабіста да старшыні яго тав. Ганько, але і гэта безрэзультатна.

УВАШНЁЎ.

ПРАКУРОРУ Г. МЕНСКА ТАВ. ГІНЗБУРГУ.

СЯМ'І ЧЫРВОНААРМЕЙЦА НЕ ВЫДАЮЦЬ ПАЙКА

(ПІСЬМО ЧЫРВОНААРМЕЙЦА-ПЕРАМЕННІКА)

Я прызван у Чырвоную армію для праходжання чатырохмесячнага збору. На месцы, у калгасе імя Фалько (Менскі р.), засталася мая сям'я.

Певядома, на якіх падставах кіраўнікі сельпо (я працаваў у краме калгаса імя Фалько) знялі маю сям'ю са снабжэння. На маю скаргу ў райспажыўсаюз адказалі: «Мы такіх законаў не ведаем, згодна якіх сем'і чырвонаармейцаў павінны забяспечвацца пайкамі».

Так сям'і па волі бюракратаў з райспажыўсаюза на працягу трох месяцаў не атрымлівае ніякіх прадуктаў.

В. М. ШАЛЬКОЎСКІ.

АБ МСЦІСЛАЎСКІХ КААПЕРАЦЫЙНЫХ ЖУЛІКАХ І ІХ АПЕКУНАХ

У Мсціслаўскім раёне растраты, абважванне, абмерванне ў кааператыўным гандлі сталі сістэмай. У 1933 годзе па сістэме райспажыўсаюза 75 проц. кааператыўнай сеткі прымалі ўдзел у растратах, якія дасягаюць каля 100 тысяч рублёў. Растраты не спыніліся ў 1934 годзе. **За першую палову 1934 года растраты дасягаюць 33 тыс. руб.** Па адзіному гарпо растрачана ў 1933 г. 16.700 руб., у 1934 г.—6.632 руб. Прадавец **курманскай** крамы Федасенка Ігнат на атрыманыя тавары з **ходашэўскай** базы рабіў самавольнае павышэнне цэн. Атрыманая з базы мануфактура 40 метраў па дзяржаўнай цане 1 р. 90 к. метр, прадавалася па 2 р. 25 к. Нацэнка ў 35 к. на кожны метр.

Атрыманая калумбія па дзяржаўнай цане 2 р. 78 к. прадавалася па 3 руб. Лыжкі замест дзяржаўных цэн 40 кап. прадаваліся па 86 кап.; паркаль замест 2 руб. прадаваўся па 2 р. 12 к. за метр, трыко прадавалася па 7 р. 75 к. замест дзяржаўнай цены ў 7 р. 30 к. **Усе грошы, атрыманыя за самавольныя нацэнкі на тавары, цалкам прысвоены крамнікам Федасенка.** На махінацыі гэтага спекулянта і жуліка быў складзен акт і вось ужо прайшло больш двух месяцаў, **як гэты акт марынуецца ў паперах старшыні райспажыўсаюза тав. Падольнава.** Федасенка не толькі астаўся непакараным, але працягвае і далей свае жульніцкія махінацыі.

Прадавец Бімбатаўскай крамы Старасальскага сельпо Архіпаў Ілья робіць самавольныя надбаўкі цэн на тавары, асабліва на больш ходкія і дэфіцытныя. Архіпаў карыстаецца гірамі з адбітымі галоўкамі. Пры продажу хустак аднаго гатунку і размеру і аднолькавай якасці прадавец браў як з каго. Архіпаў зрабіў звычайную спажывецкую соль у Янаўскім сельсавеце востра дэфіцытным таварам. Атрымліваючы ад базы соль, ён яе трымаў доўгі час пад замком, а потым прадаў гэту соль спекулянтам па спекулятыўных цэнах і пайшчыкі асталіся без солі.

Спекулянт Архіпаў у кааперацыйнай сістэме як працаваў, так працуе і да гэтага часу.

У ходышэўскім сельпо ў цэнтральнай краме працуе загадчыкам нейкі **Цітоў,** які, будучы кладаўшчыком у калгасе імя Егорава, Мазалаўскага сельсавета, патнаіў усё насенне і зараз, працуючы ў кааператыўнай сістэме, сістэматычна абважвае пайшчыкаў.

У Забалоцкім сельпо крамніца Кандэльская растраціла грошы ў суме 1.681 руб. Крамнік Варанцоў растраціў 1.297 руб., крамнік хлышчоўскай крамы Ганчароў растраціў 1.669 руб. З растрачаных грошай 6.132 руб. па сістэме гарадской спажывецкай кааперацыі спагнана толькі 2.000 руб.

У апараце кааператыўнай сістэмы Мсціслаўшчыны, як нідзе, арыгуліліся класава-варожыя элементы, былыя спекулянты. Загадчыкамі крам працуюць Покідаў, Малкін і іншыя. Гэтыя былыя гандляры да 1927 года трымалі свае ўласныя крамы.

Не гледзячы на ўсе гэтыя абураючыя факты прамога ашуканства дзяржавы, абважвання і абмервання пайшчыкаў, судова-следчыя органы і пракуратура **не толькі не вядуць рашучай барацьбы з гэтымі класава-варожымі элементамі, а, наадварот, сталі на шлях замазвання злачынстваў класава-варожых элементаў.** Яркім прыкладам можа служыць такі факт. 15 чэрвеня ў мястэчку Росны нарсуд разглядаў крымінальную справу па абвінавачэнню загадчыка сельпо Казначэева ў тым, што апошні самавольна павышаў продажныя цэны на тавары,—чай замест 40 кап. прадаваў на 2 р. 10 к., грабёнкі замест 60 кап. прадаваў па 3 р. 10 к. Пры расследванні гэтыя факты поўнасцю пацвердзіліся. **Аднак, нарсуд прыгаварыў жуліка-крамніка толькі да двух месяцаў прымусовых работ.**

Нарсуддзя Фіткевіч нават быў гарачым прыхільнікам апраўдання гэтага злачынца. Яшчэ да гэтага ча-

МСЦІСЛАЎСКАЯ НАСЕДКА

Рыс. Вап. Мядведзева.

Праф. СУРТА — *Праф. С. ФРЫД*

АБ КІШЭЧНЫХ ЗАХВОРВАННЯХ І МЕРАХ ІХ ПАПЯРЭДЖАННЯ

З усёй агіднай спадчыны, якая нам дасталася ад буржуазна-памешчыцкага ладу, бадай, самым злым і ганебным з'яўляецца тое антысанітарнае становішча населеных месц, для перамагання якога яшчэ да гэтага часу патрабуюцца надзвычайныя намаганні. Прымітыўныя крыніцы водаснабжэння, гарады і мястэчкі з сярэднявяковымі прыбіральнямі і выграбнымі ямамі—усе гэтыя «нявыноты» атрымаў пролетарыят у спадчыну ад царызма.

Дзесяткі новапабудаваных, бездакорных у санітарных адносінах соцыялістычных гарадоў, сотні кілометраў водаправоднай і каналізацыйнай сеткі, наноў праведзенай у старых гарадах за апошнія 17 год—велізарнейшыя дасягненні ў барацьбе за чысты і культурны совецкі горад. Але, зразумела, гэта яшчэ не знішчае ўсёй спадчыны, і антысанітарнае становішча многіх нашых гарадоў і мястэчак з'яўляецца фактам. Перад намі стаіць задача—побач з капітальнымі работамі па благаўстройству гарадоў ачысціць іх хоць-бы ад гразі, якая з'яўляецца крыніцай самых рознастайных захворванняў.

Найбольш частымі спадарожнікамі гразі з'яўляюцца **страўніка-кішэчныя захворванні**—брушны тыфус, дызэнтэрыя і некаторыя іншыя. Мікробы-ўзбуджальнікі гэтых хвароб, трапляючы ў кішэчным тракце хворага і, выдзяляючыся разам са спражненнямі трапляюць у акружаючае асяроддзе. Усякі прадмет, на якім ёсць хоць-бы ледзь заўважаныя сляды выдзяленняў кішэчнага хворага, **мае ў сабе заразу і можа служыць крыніцай заразы для акружаючых.** Трапляючы з кішэчніка хворага ў знадворнае асяроддзе, мікроб гіне не адразу: на харчовых прадуктах, на бялізне хворага, на розных прадметах, акружаючых хворага, узбуджальнікі дэзінтэрыі і тыфуса астаюцца жывымі **на працягу многіх дзён,** а ў глебе, асабліва забруджанай, гэтыя мікробы захоўваюць жыццяздольнасць і свае хваробатворныя ўласцівасці больш трох-чатырох месяцаў.

Адсюль зразумела, якую ролю ў распаўсюджванні кішэчных захворванняў адыгрывае хворы, **як заразлівы яго выдзяленні** і як трэба адмежаваць глебу, прадукты і інш. прадметы ад выдзяленняў хворага.

Не зусім благавідную ролю можа часамі адыграць у сэнсе распаўсюджвання хваробы чалавек, які здаецца на выгляд зусім здаровым. Гэта—так званы **бацыланосьбіт,** або бацылавыдзяліцель. Арганізм такога чалавека, аказваючы супраціўленне трапіўшаму мікробу, сам астаецца непашкоджаным (толькі на выгляд), але ў той-жа час яго кішэчнік з'яўляецца рэзервуарам заразы і пагрозай для ўсіх акружаючых.

Велізарную ролю ў распаўсюджванні кішэчных захворванняў бясспрэчна адыгрываюць мухі. Раней думалі, што мухі пераносяць заразу толькі механічна—на хабатку і лапках. Зараз-жа эксперыментальна даказана, што ўзбуджальнікі, напрыклад, дэзінтэрыі добра ўжываюцца ў кішэчніку казяўкі на працягу 5-3 дзён і ўвесь гэты час муха здольна перадаваць заразу праз свае выдзяленні.

Асабліва часта распаўсюджваюцца страўніка-кішэчныя захворванні **ў летні час.** Высокая тэмпература, аслабляючы арганізм, робіць яго менш устойлівым да ўсякага роду захворванняў, асабліва да кішэчных. **Гародніна і фрукты, ягады і зелень** самі па сабе з'яўляюцца не зусім удобаварымай жыўнасцю, бо маюць у сябе многа клятчаткі. А паяданне іх часамі ў вялікіх размерах (асабліва дзяцьмі) дае непасільную нагрузку кішэчнаму каналу, выклікае запаліцельныя з'явы і ў значнай меры аслабляе яго супраціўляемасць. Апрача таго, не трэба забываць, што фрукты і гародніна скрозь і ўсюды захоўваюцца на полай, часамі загаджанай, зямлі, на забруджанай саломе і такім чынам могуць быць густа ўсеяны заразлівымі мікробамі.

Такавы асноўныя крыніцы і шляхі распаўсюджвання страўніка-кішэчных захворванняў.

Адсюль вынікаюць важнейшыя мерапрыемствы па барацьбе з гэтымі хваробамі і меры асабістага захавання ад іх.

Галоўным рэзервуарам, галоўнай крыніцай заразы ў канчатковым выніку з'яўляецца захварэўшы. Гэта настойліва дыктуе неабходнасць кожнага страўніка-кішэчнага хворага ізаляваць, змясціць у больніцу.

Апрача таго, што ў лекавай установе хворы будзе забяспечан медыцынскай дапамогай, што там ён будзе карыстацца належным дотлядам і неабходным лячэннем, ізаляваць хворага важна ў інтарэсах акружаючых. Частата спражненняў пры кішэчных захворваннях і велізарная колькасць выдзяляемых пры гэтым мікробаў не дазваляюць нават чыстаплотнаму хвораму захоўваць неабходную ахайнасць. Забруджваюцца бялізна і вопратка, забруджваюцца акружаючыя прадметы, забруджваюцца, нарэшце, рукі даглядаючага хворага, і такім чынам рассейваецца зараза. Калі нават у добра абсталяваных лекавых установах не заўсёды ўдаецца папярэдзіць заражэнне вопытнага бальнічнага персанала, то ці можна паручыцца, што ў хатняй абстаноўцы сваякі, не заўсёды кампетэнтныя ў пытаннях гігіены, не захварэюць і не перанясуць заразу на іншых. **У інтарэсах грамадства і ў інтарэсах самога хворага неабходна зараз-жа па высвятленню хваробы змясціць яго ў больніцу.**

Выдзяленні хворага трапляюць у выграбныя ямы і прыбіральні. **Ачыстка прыбіралень і выграбных ям** таму павінна быць адным з галоўнейшых клопатаў жаўтаў і асобных жыхароў. Трэба памятаць, што ў выдзяленнях не толькі хворых, але часамі і здаровых могуць утрымлівацца мірыяды заразлівых мікробаў. Таму зусім недапушчальна выліваць нечыстоты абы дзе, як гэта ў нас яшчэ многія робяць.

Жакты абавязаны клаўціцца не толькі абачысты, але і аб **дэзінфекцыі** (абеззаражванні) **сметнікаў і прыбіралень.** У кожным жакце павінен быць запас нягашанай вапны, карболавай кіслаты або іншага дэзінфектуючага сродку. Не радзей, чым праз 2-3 дні трэба рабіць засыпку, або заліўку нечыстот.

Такога роду дэзінфекцыя не толькі абяскшоджвае нечыстоты, але і спрыяе знішчэнню мух—галоўных пераносчыкаў кішэчнай заразы. З мухамі трэба весці **бязпітасную барацьбу.** У сталовых, буфетах, рэстаранах, у складах, дзе захоўваюцца прадукты--усюды неабходна ўсімі даступнымі сродкамі ліпкай паперай, мухаморам, фармалінам і інш.) знішчаць мух. Яшчэ важней не дапускаць іх размнажэння, а таму не трэба пакідаць адкрытымі харчовыя прадукты, крошкі на сталах пасля яды, выдзяленні хворага і т. д.

Вышэй было ўказана якую ролю ў распаўсюджванні страўніка-кішэчных захворванняў адыгрываюць фрукты і гародніна.

Не злоўжываць сырымі фруктамі, ужываць іх толькі пасля добрага абмывання гатаванай, а яшчэ лепш гарачай, вадой. Прыходзіцца часамі адзіўляцца, бачачы, як людзі, якія лічаць сябе культурнымі, прама з латка, з кошыка ядуць яблыкі, гуркі, ягады і т. д. **Гэта некультурна таму, што шкодна.**

Многія мікробы—узбуджальнікі кішэчных хвароб месяцамі жывуць і размнажаюцца ў вадзе. Некаторыя могуць нават перазімаваць у лёдзе, і вясной, з наступленнем цяпла, даць новы выбух хваробы. Адсюль зразумелы лозунг: **«Не пі сырой вады».** Гатаванне забівае мікробы і такім чынам захоўвае ад заразы.

Найбольш эфектнай мерай барацьбы з распаўсюджваннем страўніка-кішэчных захворванняў з'яўляюцца **прывіўкі.** Рамкі газетнага артыкула не дазваляюць падрабязна спыніцца на прынцыпах, на якіх аснаваны прывіўкі, на пытаннях «што мы прывіваем», чаму 2-3 уколы забяспечваюць ах хваробы і т. д. Але вось ужо паўвека чалавецтва карыстаецца метадам прывівак і колькі мільёнаў жыццяў, колькі людзей захавана дзякуючы гэтаму простаму, абсалютна бяскшоднаму, спосабу.

Між іншым, коснасць пракладвае сабе дарогу ўсюды. І ў адносінах прывівак можна яшчэ сустрэць безнадзейных абываталяў, якія глядзяць на «укол» ледзь не са страхам першабытнага чалавека. Ці варта даказваць, што гэты страх ёсць прадукт невуцтва і што гэта невуцтва будзе зжыта разам з усім тым гнілым і брудным, што нам дасталося ад старога свету.

Прыбіраючы сцяны, пракуратуры ляжаць дзесяткі спраў, накіраваных райспажыўсаюзам для прыцягнення розных растратчыкаў да адказнасці. Так, у пракуратуру была перададзена справа аб растраце ў памазалаўскім сельпо з 20 чэрвеня 1933 г., але да гэтага часу ніякія меры па гэтай справе не прыняты. Па дзютчыцкаму сельпо крамнікам Федарэнка растрачана 990 руб. Справа перададзена міліцыі 31 кастрычніка 1933 г., але да гэтага часу ніякіх меры начальнікам міліцыі Дуняком не прыняты. Гэтыя факты красамоўна гавораць аб тым, што людзі страцілі класавую пільнасць, праяўляюць гнілы лібералізм у адносінах злачынцаў.

Рэдактар выязной рэдакцыі «Звязды» **В. БЕРМАН.**

АД РЭДАКЦЫІ: «Звязда» чакае, што пракуратура рэспублікі Вярхоўны суд і Мсціслаўскі РК для пакарання злачынцаў і іх «апекуноў» прымуць тэрміновыя меры.

За рубяжом

ЯПОНІЯ РЫХТУЕЦЦА ДА „КРЫЗІСА 1935-36 ГОДА“

ТОКІО, 9 жніўня. (БЕЛТА). Агенцтва «Сімбун рэнго» паведамляе, што сёння ў міністэрстве замежных спраў адбываецца канферэнцыя японскіх паслоў па пытаннях падрыхтоўкі да «крызіса 1935-36 года».

На канферэнцыі побач з кіруючымі чынамі міністэрства замежных спраў прымаюць удзел пакуль та прыбыўшыя з-за граніцы Сайто (японскі пасол у ЗША), Сато (пасол у Францыі), Мацуока (пасланнік у Італіі), Танія (савецнік японскага пасольства ў Манчжуо) і былы генеральны консул у Цяньцзіне Курыбара.

* *

Захватніцкая авантура японскіх імперыялістаў у Манчжурыі не апраўдала лозунгу аб «раі» і «ажыўленні». Вайна склала дэфіцыт у 1 млрд. іен. Крызіс паглыбляецца, расце беспрацоўе і голад. Народныя масы рэволюцыянізуюцца.

У гэты момант японскія кіруючыя колы высоўваюць лозунг «Рыхтуйцеся да крызіса 1935-36 г.» г. зн., што да гэтага тэрміну Японія будзе перажываць небывалае крызіснае становішча. Да гэтага часу канчаюцца тэрміны вашынгтонскага і лонданскага морскіх дагавораў. Амерыканскі флот перавысіць японскі; з прычыны выхаду з Ліігі нацый Японія павінна будзе вярнуць мандат на паўднёвыя асравы; будзе ў вялікай меры выкавана другая пяцігодка ў СССР; кітайская рэволюцыя разгорнецца шчэ шырэй, умацуецца Совецкі Кітай; і, нарэшце, набліжаецца тое, аго японская буржуазія баіцца больш за ўсё — паўстанне мас.

Лозунг «Крызіс 1935-36 г.» выкінут, каб стрымаць нездаваленне дробнай буржуазіі, падавіць рэвалюцыйнае супраціўленне, з'яднаць сё сілы пад кіраўніцтвам рыхтуючайся да горшага ваеннай зграі.

* *

ПАГЛЫБЛЕННЕ АГРАРНАГА КРЫЗІСА У ЯПОНІІ

ТОКІО, 9 жніўня. (БЕЛТА). Паодле даных японскага міністэрства земляробства, побач з паглыбленнем аграрнага крызіса, хутка растае лік канфліктаў паміж земеўласнікамі і дробнымі арандатарамі. Першая палавіна бягучага года паказвае рэкордны лік арэндных канфліктаў за апошнія гады, — 2594 супроць 2207 у першай палове 1933 года, пры чым у бягучым годзе 70 проц. усіх канфліктаў звязана з разрывам арэндных дагавораў з памешчыкамі. У канфліктах удзельнічала 19420 арандатараў і 106 землеўласнікаў.

* *

НАПАД ЯПОНСКІХ СЯЛЯН А. УПРАЎЛЕННЕ ГУБЕРНАТАРА

ТОКІО, 10 жніўня. (БЕЛТА). Газета «Асахі» паведамляе, што 6 жніўня група сялян каля 600 чалавек, незадаволеная дзеяннямі мясцовых улад, накіравалася ў горад Цумамота і напала на ўпраўленне губернатара прэфектуры. Пры сутычцы з паліцыяй некалькі чалавек ранена. Паліцыяй зроблены арышты.

* *

МІЖНАРОДНАЯ ХРОНІКА

У Румынію з боку Балгарыі прарвалася ўзброеная група Коміталджы. Група раззброіла румынскую пагранічную варту.

Чан Кай-шы вылецеў у Фучоў, для таго каб узяць у свае рукі і камандаванне нанкінскімі войскамі, якія дзейнічаюць супроць атрада кітайскай Чырвонай арміі.

У Прусіі забаронены ўсе без выключэння творы Максіма Горкага. Кнігі Максіма Горкага на нямецкай мове належаць канфіскацыі.

Совецкі Саюз прымае ўдзел міжнародным кірмашы ў Ізміры (Турцыя), які адкрываецца 25 жніўня. Уся падрыхтоўчая работа да кірмаша, праводзімая Усесаюзнай гандлёвай палатай, скончана.

АБ ТЭЛЬМАНЕ НЯМА НІЯКІХ ВЕСТАК

ПАРЫЖ, 9 жніўня. (БЕЛТА). «Юманітэ» піша:

«На працягу некаторага часу не ўдаецца атрымаць ніякіх вестак аб Тэльмане. Ездзіўшыя нядаўна у Германію дэлегацыі не змаглі наведаць не толькі самога Тэльмана, але і нават сустрэцца з яго жонкаю. Невядома, дзе знаходзіцца Тэльман і што збіраецца з ім рабіць нацыянал-соцыялістскі ўрад. Мы не жадалі-б заўтра дазнацца аб «самагубстве» Тэльмана або аб тым, што ён згубіў развагу ў рэзультаце фізічных і маральных катаванняў, якія прымяняюцца фашысцкімі катамі».

Згодна паведамлення «Юманітэ», Камітэт барацьбы за вызваленне Тэльмана прадпрымае кампанію з мэтай дабіцца дакладных вестак аб становішчы Тэльмана.

* *

ГІТЛЕРАЎСКАЯ „АМНІСТЫЯ“

БЕРЛІН, 9 жніўня. (БЕЛТА). У сувязі з аб'яднаннем функцый прэзідэнта і рэйхсканцлера ў руках Гітлера, урад пастанавіў аб'явіць «амністыю».

Характар гэтай амністыі дастаткова вызначаецца тым фактам, што з яе поўнасцю выключаюцца асобы, засуджаныя або прыцягнутыя да адказнасці за спробу замаху на звяржэнне існуючага ладу, за дзяржаўную здраду, а таксама за разгалашэнне ваенных тайн.

Амністыюцца толькі асобы, прысуджаныя за дробныя злачынствы крымінальнага характару к турэмнаму зняволенню на тэрміны да 6 месяцаў, або з грашовым штрафам да 1000 марак. Акрамя таго амністыюцца асобы, прыгавораныя за зняважанне асобы Гітлера і ў прыватнасці асуджаныя за злачынствы, зробленыя ў рэзультаце «вельмі вялікага парыву да барацьбы за нацыянал-соцыялістскія ідэі».

Належаць вызваленню з канцэнтрацыйных лагераў тыя, хто даўно ўжо знаходзіцца ў зняволенні, калі ёсць даныя дапускаць, што вызваляемы надалей не будзе варожа адносіцца да нацыянал-соцыялістскай дзяржавы. Ва ўказе асабліва падкрэсліваецца жаданне Гітлера, каб у добраахвотным сэнсе былі вырашаны справы тых, хто знаходзіцца у канцэнтрацыйным лагеры ў сувязі з падзеямі чэрвеня гэтага года.



Англійскія ваенныя самалёты на манеўрах

Па СССР

ПІОНЕР ВАНЯ МЯТА ВЫРАТАВАЎ АГІТСАМАЛЕТ ЭСКАДРЫЛЫ ІМЯ МАКСІМА ГОРКАГА

ОДЭСА, 10 жніўня. (БЕЛТА). Піонер ВАНЯ МЯТА, які ахоўваў уночы калгасны хлеб у полі, заўважыў, што над яго галавой кружыць самалёт. Мята зразумеў, што з машынай адбываецца штосці незвычайнае і на працягу некалькіх мінут развёў вялікі касцёр на пляцоўцы, прыгоднай для пасадкі. Машына, якая аказалася агітсамалётам эскадрыльі імя Максіма Горкага, удала зрабіла вымушаную пасадку.

ЦК комсамола Украіны за самаахвярны паступак, выкаходчывасць і дасціпнасць піонера Вані Мята, прэміраваў яго імянным гадзіннікам і патэфонам, а райком камсамола—пуцёўкай у піонерскі лагер.

На выратаваным самалёце Ваня абляцеў увесь Кадоўскі раён.

СУСВЕТНЫ РЭКОРД ПА СТРАЛЬБЕ З ДРОБНАКАЛІБЕРНАЙ ВІНТОЎКІ

МАСКВА, 10 жніўня. (БЕЛТА). 9 жніўня на першым стралковым злёце майстроў «Дынамо» 7 дынамаўцаў пабілі сусветны рэкорд на стральбе з дробнакаліберной вінтоўкі, устаноўлены ў 1931 годзе на міжнародных стралковых спаборніцтвах у Львове прадстаўніком Польшчы Падоскім.

Дынамавец Одналеткаў (Масква) у стральбе на 100 і 200 метраў выбіў 579 ачкоў з 600 магчымых, у той-час, як Падоскі, пры тых-жа ўмовах, выбіў толькі 569 ачкоў. Рэзультат другіх 6 рэкардсменаў дынамаўцаў хістаецца паміж 570—577 ачкамі з 600 магчымых.

Сусветны рэкорд у стральбе на 200 метраў 278 ачкоў з 300 магчымых у той-жа дзень выбілі 22 дынамаўцы.

УСЕСАЮЗНЫЯ ПІОНЕРСКІЯ СПАБОРНІЦТВЫ ЗАКОНЧЫЛІСЯ

Піонеры Масквы на першым месцы па стральбе з дробнакаліберной вінтоўкі і лука

МАСКВА, 10 жніўня. (БЕЛТА). На ўсесаюзных піонерскіх спаборніцтвах, якія закончыліся 8 жніўня, па стральбе з дробнакаліберной вінтоўкі і лука каманднае пяршынства ўзялі піонеры Масквы, выбіўшыя 522 ачкі.

Маскоўская каманда стралкоў узнагароджана пераходным сцягам Цэнтральнага Совета Асоавіяхіма.

РЫХТУЕЦЦА ЗБОРНІК ПЕСЕНЬ ПРА ЧЭЛЮСКІНЦАЎ

КІЕЎ, 10 жніўня. (БЕЛТА). Оргкамітэт Саюза совецкіх кампазітараў Украіны рыхтуе зборнік песень пра чэлюскінцаў, прысвечаны гераічнаму паходу ў Арктыку. У зборніку будзе 20 песень, музыку да якіх пішуць кампазітары Нэвіцкі, Клабанаў, комсамолка-кампазітар Шутэнка і іншыя.

ПРАВЕРКА АТРЫМАННЯ АБЛІГАЦЫЙ КАЛГАСНІКАМІ

МАСКВА, 10 жніўня. (БЕЛТА). Наркамфін СССР прапанаваў Наркамфінам саюзных і аўтаномных рэспублік, усім фінансавым органам і ўпраўленням дзяржаўных працоўных ашчадкас арганізаваць праверку атрымання калгаснікамі аблігацый на суму выплачаных імі ўзносаў. Праверка пачнецца па ўсяму саюзу не пазней 20 жніўня і закончыцца да 10 верасня.

ТУРЭЦКІЯ СПАРТСМЕНЫ ПРЫЕХАЛІ У ЛЕНІНГРАД

ЛЕНІНГРАД, 9 жніўня (БЕЛТА). 9 жніўня ў Ленінград з Масквы прыехала турэцкая спартыўная дэлегацыя.

ДРУГІ УСЕБЕЛАРУСКІ З'ЕЗД РАБОТНІКАЎ ЮСТЫЦЫІ

Учора на ранішнім пасяджэнні з'езда прадаўжаліся спрэчкі па дакладах тт. Кузьміна і Пінкуса.

Пракурор г. Менска тав. Гінзбург у сваім выступленні адзначыў, што з боку міліцыі наглядаецца рад момантаў перавышэння сваіх правоў. Асобныя работнікі міліцыі часамі незаконна саджаюць пад арышт, і, не гледзячы на пратэсты пракурора, незаконна пасаджаныя не выхаляюцца.

Выступіўшы намеснік пракурора рэспублікі БССР тав. Глезераў адзначыў, што раённыя пракуроры не вядуць дастатковай барацьбы за якасць прадукцыі на прадпрыемствах, у сельскай гаспадарцы. Асобныя пракуроры не аддаюць ніякай увагі жывому чалавеку, не праяўляюць патрэбнай чуласці пры разглядзе спраў, зацягваюць справы, не даюць наведвальнікам дакладных адказаў. Тав. Глезераў завастрыў увагу пракураў і народных суддзяў на неабходнасць аддаць максімум увагі якаснаму правядзенню ўборкі, хлебапаставак, барацьбе з кляшчом і т. д.

Другі з'езд работнікаў юстыцыі віталі прадстаўнікі падшэфнага калгаса імя Сталіна, Чэрвеньскага раёна.

У канцы пасяджэння з вялікай прамовай выступіў спатканы бурнымі апладысментамі старшыня Совета Народных Камісараў тав. К. М. Галадзед.

* *

На вячэрнім пасяджэнні з вялікай прамовай выступіў сакратар ЦК КП(б)Б тав. Н. Ф. ГІКАЛО.

З'яўленне тав. Гікало ў зале з'езда было спаткана бурнай, доўга незмаўкаючай авацыяй. Дэлегаты з'езда, стоячы, віталі кіраўніка КП(б)Б.

Прамова тав. Гікало часта перарывалася гучнымі воплескамі ўсяго з'езда.

Пасля прамовы тав. Гікало з'езд прыняў рэзалюцыю па дакладу тав. Кузьміна.

* *

Сёння будуць працаваць секцыі.

АБ АНТЫДЗЯРЖАЎНЫХ ТЭНДЭНЦЫЯХ І РАСКРАДВАННІ СОЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ УЛАСНАСЦІ

У сувязі з праяўленнем антыдзяржаўных тэндэнцый, прыёмкай зярна заражонага кляшчом і раскрадваннем соцыялістычнай уласнасці, пракуратура рэспублікі прымае рашучыя меры для знішчэння гэтых злачынстваў.

За апошні час у БССР выяўлены рад антыдзяржаўных тэндэнцый у калгасах. Гэтыя тэндэнцыі праяўляюцца ў зніжэнні даных аб ураджайнасці і скарыстанні збожжа першага абмалоту на свае патрэбы, замест здачы дзяржаве.

Змяншэнне даных аб ураджайнасці, з мэтай захаваць сапраўдныя размеры ўраджаю мела месца ў Бабруйскім, Глускім, Слуцкім, Старобінскім, Асіповіцкім і Копыльскім раёнах. Калгас «Чырвоная Дуброўна», Слуцкага раёна, паказаў ураджайнасць жыта 3,5 цэнт. з гектара, замест сапраўдных 8,5, аўса 2,4 цэнт. замест 12 цэнт. Калгас «Красін», Глускага раёна, вызначыў ураджайнасць жыта з гектара ў 6 цэнт. замест 12, аўса—5 замест 10. Пракуратура рэспублікі даручыла райпракурорам тэрмінова зрабіць расследаванне і вінаватых прыцягнуць да адказнасці.

У многіх месцах выяўлены грубыя парушэнні пастановы ўрада аб скарыстанні 10 проц. абмалочанага ўраджаю на калгасных патрэбы. Старшыня калгаса «Перадавік» (Плешчаніцкі раён) Прагор Іван увесь першы абмалот 2625 кгр. жыта размеркаваў па прападніх калгаснікам, не здаўшы нічога дзяржаве. У калгасе «Іскра» (Петрыкаўскі раён) увесь першы абмалот жыта 1.680 кгр. змалолі і 1.334 кгр. раздалі калгаснікам. Следства па гэтай справе закончана і старшыня калгаса Казловіч аддаецца пад суд.

Сіламі груп садзейнасці па Ўздзенскаму раёну была праведзена праверка падрыхтаванасці складаў да прыёмкі ўраджаю. На ўздзенскім вінным заводзе склад да прыёмкі зярна не падрыхтован: не было зроблена засекаў, не адрамантавана страха і інш. Дырэктар завода Калдановіч ніякіх мер да правядзення рамонту не прымаў, за што прыгаворан да 6 месяцаў папраўчаа-працоўных работ. Адказны па якасці склада мазырскага Заготзярна Корзук Архіп прыняў ад калгаса «Леніна» заражаны кляшчом у другой стадыі ячмень, чым заразіў ўсё збожжа, якое было ў складзе. Корзук прыгаворан судом да аднаго года папраўча-працоўных работ.

У параўнанні з мінулым годам, раскрадванне ўраджаю з поля сёлета значна зменшылася, што тлумачыцца лепшай арганізацыяй аховы ўраджаю на корані. Па меўшых месца выпадках раскрадвання ўраджаю з поля, пракуратурай было праведзена рад працэсаў. Напрыклад, у Чэрыкаўскім раёне кулак Крыскін Апанас сістэматычна пасылаў сваіх дзяцей зрываць каласы на полі калгаса «Чырвоны сцяг». Нарсудом Чэрыкаўскага раёна кулак Крыскін засуджаны да 10 год пазбаўлення волі. (БЕЛТА).

У аэраклубе імя Молакава

Школа пілотаў без адрыву ад вытворчасці

Менскі цэнтральны аэраклуб імя Молакава пачаў падрыхтоўку да дня авіяцыі. У планерных гуртках разгорнута соцпаборніцтва на лепшы гурток і інструктара. У сучасны момант па Менску працуе 20 планерных гурткоў з ахопам 450 чалавек. Для гэтых гурткоў ужо набыта 18 планераў, а да дня авіяцыі будзе набыта яшчэ два планеры.

Да дня авіяцыі аэраклуб заканчвае пабудову парашутнай вышкі на 25 метраў вышыні. Зараз па буйнейшых прадпрыемствах Менска арганізоўваюцца парашутныя гурткі.

У сувязі з днём авіяцыі аэраклуб імя Молакава ў бліжэйшыя дні правядзе 4 агітпалёты па Менскаму раёну.

(БЕЛТА).

КАШТОЎНАЕ ВЫНАХОДНІЦТВА КАЛГАСНІКАЎ КАЛГАСА „КОМСАМОЛ ГОМЕЛЬШЧЫНЫ“

ІЛЬНОМАЛАТАРНЯ НОВАЙ КАНСТРУКЦЫІ

Калгаснікі калгаса «Комсамол Гомельшчыны», Раманавіцкага сельсовета, Гомельскага раёна, прыстасавалі звычайную конную малатарню для спецыяльнага абмалоту ільну.

Усё прыстасаванне заключаецца ў тым, што праз станок малатарні пракладваюцца ўпоперак дзве жалезныя восі з прымацаванымі драўлянымі валікамі да іх канцоў. На сярэдзіне адной з асей насаджан шкіў для паса коннага прывода.

Лён падаецца ў стык драўляных валікаў, якія, як ужо зазначалася, знаходзяцца на канцах восі. Гэтыя валікі абціраюць—вымалочваюць—галоўкі ільну. Лён абмалочваецца чыста і хутка. Для абслугоўвання самой малатарні патрэбны толькі два чалавекі.

ДЗЕЦІ АЎСТРЫЙСКІХ ШУЦБУНДАЎЦАЎ НА СТ. НЕГАРЭЛАЕ

СУД

АШУКАНЦЫ ДЗЯРЖАВЫ, РАБАЎНІКІ СПАЖЫЎЦА

(Ад барысаўскага карэспандэнта «Зеязды»).

Шайка машэннікаў з вялікім і малым стажам «гандлёвых» аперацый звіла сабе гняздо ў ЗРК Барысаўскага дрэваапрацоўчага камбіната «Кімінтэрн». Яна доўгі час нажывалася за лік рабавання спажыўца. Яе метадам было збважванне.

«Загадчык» крамы № 1 — Клябанаў Барыс у сваёй краме вагі ўстроіў так, што на кожныя 10 кіло адважаных на гэтых вясах атрымліваецца недаважанага 1 кіло. Такім чынам кожны дзень Клябанаў без асаблівых клопатаў атрымліваў «эканомію» ў некалькі кіло прадуктаў, якія пазнны былі пайсці рабочаму спажыўцу.

У краме № 3 «канкураваў» з Клябанавым другі жулік — Баркан. Усе гіры, якімі Баркан адважваў рабочым паёк, аказаліся меншай вагі на 3-5 грам.

Ржэўскі за кароткі час «працы» ў краме № 6 растранжыраваў прадуктаў на 480 р., якія былі ім «з'эканомлены» шляхам прымянення аблегчаных гір.

Чацверты жулік—Свярдлоў — быў прыстроіўся на прадуктовым складзе сталовай і абкрадаў сталовую па 610 грам пры кожнай аперацыі.

Старшыня ЗРК Фейгон і яго намеснік Ацута ведалі, што ў іх крамах неправерацыя і непракляймёныя вагі і гіры, але ніякіх захадаў не прымалі, чым фактычна спрыялі абважванню рабочых.

Уся гэта шасцёрка перад Барысаўскім горсудом, які, разглядзеўшы справу злачынцаў, прыгаварыў: Клябанава да 5 год пазбаўлення волі з высяленнем у далёкія мясцовасці СССР; Баркана да чатырох год зняволення з высылкай; Ацута на 2 гады зняволення; Свярдлова на 1 год прымусовых работ; Ржэўскага на 6 месяцаў прымусовых работ.

П. ЧЫКУН.

ШТРАФЫ ПАРУШАЛЬНІКАМ ПАШПАРТНАГА РЭЖЫМУ

Органы міліцыі пры праверцы выканання закона аб пашпартызацыі ўстанавілі, што асобныя кіраўнікі прадпрыемстваў і ўстаноў парушаюць пашпартны рэжым, не адзначаюць на пашпартах месца работы рабочых і служачых, дапускаюць неарганізаваны прыём.

Домакіраўніцтвы і адказныя за прапіску не сочаць за своечасовай прапіскай прыбываючых і выпіскай убываючых.

За злоснае паўторнае парушэнне закона аб наборы рабочай сілы прыцягваюцца да крымінальнай адказнасці: адміністрацыя свінаадкормачнага цэнтра (Менск), соўгас «Комсамолец» (Менск), начальнік будаўніцтва Нядзельцаў і начальнік будаўніцтва Бруевіч.

Парушыўшыя ў першы раз закон аб пашпартызацыі органамі міліцыі аштрафаваны:

Бярнацкі І. С. (Акадэмія Навук) за прыём бяспашпартнага—на 100 руб.; дырэктар завода «Чырвоная зара» Капаніцкі С. Т. за прыём на работу з непрапісаным пашпартам—на 100 руб., загадчык сталовай Мединстытута Талерчык Д. І. за прыём на работу з непрапісаным пашпартам—на 50 руб.; кіраўнік справамі Белдрэва Гімпель Т. К. за адсутнасць адзнак на пашпартах рабочых—на 50 руб.

За парушэнне правіл прапіскі і выпіскі жыхароў аштрафаваны Лусціи С. І., Кузняцоў П. В., Гумбін А. С., Сегаль П. П., Вярбіцкая Е. І., Падзерачаў П. Е. па 50 руб. кожны; Сонкін Г. А. і Зількінд А. Ш. па 40 руб. кожны.

ЭЛЕКТРЫЧНАСЦЬ У КАЛГАСЕ

БАРЫСАЎ.

Калгас «Чырвоная Зорка» заканчвае будаўніцтва калгаснай электрастанцыі. Станцыя пабудавана выключна на сродкі калгаса. Кошт пабудовы — 16 тыс. руб.

Электрастанцыя асвеціць 200 хат калгаснікаў. Галоўная-ж мэта станцыі — абслугоўванне вытворчых патрэб калгаса. Малатарні, сячкарні, піла-цыркулярка — усё гэта будзе прыводзіцца ў рух электрычнасцю.

К.

Адказ. рэдактар Н. ЛЕНЦНЕР.

ПАМЯШКАЎСКАЕ ЕЛАЗЯРЖТЭАТРА | БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ТЭАТР ОПЕРЫ І БАЛЕТА

Сёння, 11 жніўня

ПІКАВАЯ ДАМА

опера ў 3-х дзеях і 7 малюнках, муз. П. ЧАЙКОЎСКАГА.

Мастакі кіраўнік засл. арт. рэсп. Гітгерц І. А.

Пачатак у 8 гадз. 30 мін. веч.

Білеты ў касе тэатра і ў раб. касе.

Гомаўскі кіно-тэатр «Чырвоная Зорка». Мастацкі фільм камедыя КАХАННЕ АЛЁНЫ На летн. эстрад КАНІЭРТЫ

Кіно «Інтэрнацыянал» Мастацкі фільм Жанчына з ярмаркі

Кіно «СПАРТАК» Выдатны мастацкі фільм АПОШНІ АТРАКЦЫЁН драма ў 6 частках

РАГАЧОЎСКІ ПЕДТЭХНІКУМ І АДНАГАДОВЫЯ ПЕДКУРСЫ

аб'яўляюць НАБОР

студэнтаў і курсантаў на 1934-35 навучальны год.

Студэнты забяспечваюцца стыпендыяй і паспяховасці і інтэрнатам.

Прымаюцца асобы з адукацыяй за няпоўную сярэднюю школу і непазбўленых выборчых правоў.

Усе паступаючыя праходзяць прыём па іспытах.

Заявы прымаюцца да 1 верасня. Да заявы дадаць дакументы: аб адукацыі, соцыяльным стаце, нараджэнні, выбарчым праве і маркі на 20 кап.

Адрас: г. Рагачоў, БССР, педтэхнікум.

Дырэкцыя.

ДЗЯРЖЦЫРК

ПРЫЕХАЛІ І ВЫСТУПАЮЦЬ трупа Сярэдняй Азіі 10 НАДЫР-ГУЛЯМ 10

Вядомае дрэсіроўшчыцы папугаяў НЕДЗІН.

Дрэсіроўшчыца вярблюдаў ГУЦІ ХАНУМ. і шмат новых нумароў.

ПАЧАТАК у 9 гадзін вечара.

12-і 18 жніўня ў 2 гадз. дня РАНІШНІКІ пры ўдзеле новых артыстаў і па зменшаных цэнах.

Цэнтральная жывёлагадоўчая калгасная школа пры ВКЗВ (Копысь, Аршанскі раён)

аб'яўляе АСЕННІ НАБОР

Школа рыхтуе загадчыкаў буйных калгасных таварных ферм, інструктароў райзаў і кантролёў асістэнтаў. Тэрмін навучання 9 месяцаў. Курсанты забяспечваюцца стыпендыяй ад 100 да 150 р., інтэрнатам, пасцельнымі прыладамі, сталоўкай, пральняй і інш. У школу прымаюцца асобы, маючыя агульную адукацыю не менш 4-х груп і стаж кіруючай работы ў калгасе (старшыні калгасаў, загадчыкі ферм, брыгадзіры і т. д.) не менш 2 год.

Узрост паступаючых не ніжэй 20 год. Усе паступаючыя ў школу павінны прайсці адборачную камісію пры райзаў і мець наступныя дакументы: аб соцыяльным становішчы, водпыт ад праўлення калгаса, засведчаную анкету, камандзіроўку ад райзаў.

Заявы прымаюцца да 25 жніўня. Пасля спецыяльнага адбору кожнаму падаўшаму заяву будзе аб'явлена аб дапушчэнні да іспытаў. Дарога ў школу аплачваецца за кошт камандзіруючых арганізацый. Іспыты з 28 жніўня па 3 верасня. Пачатак заняткаў 5 верасня.

Адрас: Копысь, Аршанскага р-на ЦЖКШ

Дырэкцыя.

Менскі рабф і пры Ленінградскім Аўтадарожным інстытуце

працягвае ПРЫЁМ

на ўсе КУРСЫ

вячэрняга аддзялення да 18-VIII.

Прыём заяў на дзённае аддзяленне спынен.

Умовы прыёму гл. „Звязду“ ад 30-VI і 2. VII—34 г.

Дырэкцыя.

Гомельскі дзяржаўны педагагічны інстытут

адкрыў ПРЫЁМ

на польскае аддзяленне

ЗАВОЧНАГА СЕНТАРА

Ін-т па фізіка-матэматычнаму і хімікабіялагічнаму цыклах. Прымаюцца настаўнікі польскіх школ і інш. грамадзяне з адукацыяй за сярэднюю школу.

Прыём заяў да 1 верасня.

Разам з гэтым да 1 верасня працягнут прыём на завочны сектар па матэматычнаму, фізічнаму, хімічнаму і біялагічнаму аддзяленнях.

Заявы з дакументамі (анкета, дакумент аб адукацыі, соцпаходжанні і соцстановішчы) накіроўваць па адрасу: Гомель, Пролетарская, 2, Педінстытут, Завочны сектар.

Дырэкцыя.

Менскі гарадскі аддзел Карасветы

аб'яўляе, што ПРЫЁМ ЗАЯЎ

ад унаў паступаючых у школу і РЭГІСТРАЦЫЯ ВУЧНЯЎ

ва ўсіх школах гор. Менска будзе праведзена з 7 па 20 жніўня 1934 г.

Прыём заяў і рэгістрацыя праводзяцца ў школах штодзённа (за выключэннем выхадных) з 12 да 3-х гадзін дня і з 5 да 7 гадзін вечара

Для вучняў, якія будуць знаходзіцца ў час рэгістрацыі ў лагерах, тэрмін рэгістрацыі—з 20 па 25 жніўня ў тым-жа гадзіны.

Пры наступных школах існуюць групы III канцэнтра:

1 бел.—VIII і IX	класы	7 яўр.—XIII	клас
2 бел.—VIII і IX	„	4 руск.—VIII, IX і X	класы
20 бел.—VIII, IX і X	„	5 руск. VIII, IX і X	„
25 бел.—VIII IX і X	„	9 руск.—VIII і IX	„
36 бел.—VIII і IX	„	6 польск.—VIII і IX	„
12 яўр.—VIII, IX і X	„		

Дадаткова адкрываюцца дзве рускія школы: № 42, Пляц Волі (былы будынак ЦВК) і № 11 -Комунальная, 32.

Заг. ГорАНА КУЗНЯЦОВА.

ЗАГАД

ПА МЕНСКАМУ ГОРАНА АД 4 ЖНІЎНЯ 1934 г.

Прапаную ўсім настаўнікам горада Менска і раёна вярнуцца з чарговага адпачынку і з'явіцца 16 жніўня 1934 г. у школу, дзе рашэнні прапавалі, зарэгістраваўшы сваю яўку ў дырэктара, або ў загадчыка школы.

Несвоечасовая яўка без уважлівых прычын будзе разглядацца як прагул.

Дырэктарам, загадчыкам школ далажыць мне 17 жніўня аб нез'явіўшыхся ў школу настаўніках.

Загадчык ГорАНА КУЗНЯЦОВА.

ПАСТАНОВА

Народнага Камісарыята Асветы БССР

8 жніўня 1934 г. г. Менск.

Настаўнікі т. Дзярэч І. (Чырвона-Слабодскі раён) і тав. Ладуцька І. Я. (Дзяржынскі р-н) пакінулі вучобу на курсах па гісторыі і геаграфіі пры Менскім педінстытуце без дазволу адміністрацыі курсаў.

За самавольны ўход з вучобы на курсах т. т. Дзярэчу І. і Ладуцька І. Я. абвяшчаць вымову.

Прапанаваць заг. Чырвона-Слабодскага і Дзяржынскага РайАНА патрабаваць ад іх тлумачэння аб прычынах уходу з курсаў і прадставіць мне.

Народны камісар асветы ЧАРНУШЭВІЧ.

ДЗЗІНФЕКЦЫЙНАМУ БЮРО пры ЦК „Чырвонага Крыжа“

патрэбны: планавік і чорнарабочыя на сталую работу.

Звяртацца па адрасу: вул. Карла Маркса, 3—Дзэбюро.

ГАЛОЎДАРТРАНСУ БССР

патрэбны галоўныя і ст. бухгалтары

для пастаяннай работы ў апараце і на перыферыі.

Звяртацца: Дом Урада, пакой 639 галоўнаму бухгалтару.

Полацкі тэхнікум механізацыі сельскай гаспадаркі (аўто-трактарны)

аб'яўляе асенні набор

студэнтаў на першы і другі курсы.

Тэхнікум рыхтуе тэхнікаў-механікаў па рамонту і эксплятацыі аўтомашын, трактароў і сельска-гаспадарчых машын для соўгаснай сістэмы Наркамсоўгасаў.

Прымаюцца асобы ад 16 да 30 год, скончыўшыя самігодку, ШКМ, ФЗВ, соўгас вучы і курсы па падрыхтоўцы ў ВНУ і тэхнікумы.

Да заявы дадаць да 20 жніўня наступныя дакументы: засведчаную анкету, давядкі: аб нараджэнні, адукацыі, соцстановішчы, і сошпаходжанні, здароўі, дзве фотакарткі і паштовыя маркі на 40 кап.

Іспыты—па матэматыцы, фізіцы, хімічнаму і грамадазнаўству і родной мове з 20 жніўня па 1 верасня. Заняткі распачнуцца з 1 верасня.

Студэнты забяспечваюцца стыпендыяй на агульных асновах, інтэрнатам і сталоўкай. Маецца свая гаспадарка.

Адрас: г. Полацк, вул. К. Маркса, № 43.

Дырэкцыя.

Выпускаючы — А. КРУЧКОЎ, ст. карэктар — БЯРОЗАВІК, ст. метранпаж — Н. ПЕРАКЛАДНЕЎ, ст. стэрэатыпер — Е. КАГАН, ст. друкар З. РУБІН.

Менск, друкарня «Звязды». Уп. Галоўлітбела № К—3180.